

У ЧЫМ ШЧАСЦЕ ПА-ЎЗБЕКСКУ 5

ЦУКРОВЫ ДЫЯБЕТ І COVID-19 11



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

24 ЛІСТАПАДА 2021 г. СЕРАДА № 227 (29596)

## КОРАТКА

- Тэрмін дзеяння даведак і іншых дакументаў працягваецца яшчэ на паўгода.
- **У Беларусі ўводзяць дадатковыя льготы і прэферэнцыі на ўвоз электрамабіляў.**
- Мультфільм «Нават мышы трапляюць у рай» стаў найлепшым на конкурсе «Лістападзік».
- **Беларусь упершыню прымае ўдзел у Тыдні нацыянальнай культуры Інданезіі.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ЧАРВЯКОЎ, міністр эканомікі:**

*«Можна назваць пяць прычын, чаму замежныя інвестары выбіраюць Беларусь для рэалізацыі сваіх праектаў. Першая — выгаднае геаграфічнае становішча. Калі мы акрэслім круг радыусам дзве тысячы кіламетраў, з цэнтрам у Мінску, мы ўбачым, што ў яго межах вырабляецца чвэрць сусветнага ВУП. Другая — членства ў Еўразійскім эканамічным саюзе. Тавары, выробленыя ў Беларусі, маюць свабодны выхад на 180-мільённы рынак ЕАЭС, а таксама краін, з якімі ў яго заключаны пагадненні аб свабодным гандлі. Трэцяя прычына — высокі чалавечы капітал. Чацвёртая — рэсурсны патэнцыял. Беларусь забяспечвае больш як 18 працэнтаў сусветнай патрэбнасці ў калійных угнаеннях, уласнай сыравінай — прадпрыемствы дрэваапрацоўкі і сельскай гаспадаркі. Але ключавы рэсурс — гэта ўнікальная прырода. І, зразумела, — інвестыцыйны клімат. Практычна ўся тэрыторыя краіны — гэта прэферэнцыйныя рэжымы, якія эфектыўна функцыянуюць».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Ні ў якім разе нельга зменшыць абароты»



Фота БелТА.

**ПРЭЗІДЭНТ Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам намесніка прэм'ер-міністра Аляксандра Субоціна і міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Івана Крупко. На парадку дня — сітуацыя ў аграпрамысловым комплексе.**

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што вынікі работы аграрна-прамысловага комплексу яшчэ неаднаразова будуць абмяркоўвацца. Цяпер варта засяродзіцца на будучыні. «Мяне больш за ўсё хвалюе будучая стратэгія, бягучая ўжо зразумелая: недапрацоўкі, добрае мы бачым. А вось будучыня... Мы з вамі неаднаразова абмяркоўвалі тактычныя і стратэгічныя пытанні», — адзначыў ён.

Па словах Прэзідэнта, стратэгія па АПК адна — трэба хутчэй выходзіць на экспарт прадукцыі ў сем мільярдаў долараў. Асабліва гэта важна на фоне крызісу харчавання ў свеце. ***«Гэты крызіс толькі пагаршаецца, попыт на прадукты харчавання будзе расці і, натуральна, цэны на прадукты харчавання будуць расці. Вось гэта наша стратэгія. І ні ў якім разе не зменшыць абароты»,*** — упэўнены Аляксандр Лукашэнка. І адразу папярэдзіў: нельга забываць, што свой рынак — гэта святое. Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся, якія ў сувязі з гэтым ёсць розначытанні паміж сельскагаспадарчай галіной і гандлем, мясцовымі ўладамі. І даручыў забяспечыць напаўненне стабілізацыйных фондаў.

«Адны кажуць, трэба цяпер прадаць прадукцыю, пакуль цэны высокія. Іншыя кажуць: трэба, каб стабілізацыйныя фонды былі сто працэнтаў», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён папярэдзіў, што вытворцы, перапрацоўшчыкі і гандаль адкажуць за цэнаўтварэнне на сельскагаспадарчую прадукцыю, на прадукты харчавання.

СТАР. 2

Рэпартаж з месца

# Бежанцы чакаюць больш кардынальнага вырашэння іх лёсу

Бытавыя ўмовы людзей, якія апынуліся ў складаных умовах на граніцы Беларусі і ЕС, паляпшаюцца, але гэтага недастаткова

СТАР. 4



Новы адлік

# СЭРЦА Ў ПАДАРУНАК

## Яго атрымаў 43-гадовы пацыент новага кардыяцэнтра ў Магілёве

**Медыкі называюць гэта прарывам. У пачатку лістапада ў Магілёве адкрыўся новы сучасны кардыяхірургічны корпус, і вось першыя вынікі. Бабруйчанін, які пакутаваў на гранічную сардэчную недастатковасць, атрымаў здаровае сэрца, і ёсць спадзяванні, што наперадзе ў яго — доўгае жыццё.**

— Мы ішлі да гэтай аперацыі не адзін год, — кажа **намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый МАЛАШКА.** — Усё пачалося яшчэ 12 гадоў таму, калі мы адкрывалі кардыяхірургічнае аддзяленне ў абласной бальніцы і збіралі каманду ўрачоў-спецыялістаў, выпрацоўвалі ўстойлівыя сувязі з РНПЦ кардыялогіі, бо гэта асноўны цэнтр падрыхтоўкі нашых спецыялістаў у частцы сардэчнай, сасудзістай хірургіі. І на гэтым шляху мы шмат чаго дасягнулі. У прыватнасці, у Магілёве ўжо былі аперацыі на прыпыненым сэрцы. Магчымасць здзейсніць аперацыю самай высокай складанасці з'явілася ў нас пасля таго, як мы атрымалі ад дзяржавы падарунак — сучасны кардыяхірургічны модуль у выглядзе корпуса з неабходным наборам аперацыйнага абсталявання.

Першая ў Магілёве аперацыя па перасадцы сэрца праводзілася пры непасрэдным удзеле галоўнага кардыяхірурга Беларусі, доктара медыцынскіх навук, акадэміка Беларускай Акадэміі медыцынскіх навук Юрыя Астроўскага.

— Гэта кардыяхірург з сусветным імем, — падкрэслівае Валерый Анатольевіч. — Дзякуючы яму і нашым спецыялістам дастаткова малады мужчына атрымаў магчымасць жыць. Цяжка нешта прагназаваць у гэтай сітуацыі, але тое, што ён у прытомнасці пасля некалькіх гадзін аперацыі, дае падставы казаць: шанцы даволі вялікія. Спадзяёмся, што гэта аперацыя стане прадаўжэннем жыцця.

СТАР. 3

ISSN 1990 — 763X

21227

9 771990 763008

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Ідзе падпіска на «Звязду» на І квартал або І паўгоддзе 2022 года

НАЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ!

# «Ні ў якім разе нельга зменшыць абароты»

## «Людзі павінны быць адзетыя і накормленыя»

Аляксандр Лукашэнка зрабіў акцэнт на тым, што галоўнае — каб людзі, якія маюць адносна невысокую заработную плату, маглі купіць прадукты харчавання: *«__Людзі павінны быць адзетыя і накормленыя. Я не кажу пра нейкія верталётныя грошы, пра тое, што мы будзем кагосьці адзяваць. Чалавек павінен сам пра сябе паклапаціцца__»*. Аднак, ён заўважыў, і адказнасць дзяржавы тут ёсць. Інфляцыя, рост цэн на прадукты харчавання — гэта сфера кантролю ўрада ў цэлым.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Прэзідэнт звярнуў увагу на сярэднетэрміновыя задачы, сярод якіх рамонт тэхнікі, асабліва энерганасычанай. «Мы ж не будзем за сялян рамантаваць усю тэхніку. А складаную тэхніку, энерганасычаную, трэба рамантаваць, дапамагчы ім па мінімальных цэнах. Трэба вызначыцца, у якіх месцах нашы флагманы — МТЗ, «Гомсельмаш», «Амкадор» — і іншыя дапамогуць аднавіць тэхніку на працягу зімы да вясны», — паставіў задачу ён.

Дзяржаўнай задачай назваў Аляксандр Лукашэнка таксама меліярацыю і павышэнне ўрадлівасці глебы. Звярнуў ён увагу на сучасныя інавацыйныя гаспадаркі такога тыпу як малочнатаварны комплекс «Вусце» Нацыянальнай акадэміі навук у Аршанскім раёне. Падобныя комплексы — гэта новы напрамак у раслінаводстве і жывёлагадоўлі.

«Мы дамовіліся, што вы паглядзіце, ці трэба нам гэта ўвогуле шырока ўкараняць і дзе мы будзем асвойваць гэтыя тэхналогіі. У сувязі з гэтым хацелася б, каб вы сказалі пра Віцебскую вобласць. Як там наш эксперымент, атрымаўся ці не. Ужо другі год працуем у гэтых умовах, ці атрымала Віцебская вобласць тое, чаго мы ад яе чакалі. І ў гэтыя месяцы мы пабудзем у такіх інтэграцыйных аб'яднаннях і паглядзім, як яны працуюць», — звярнуў увагу Прэзідэнт.

## Перазімаваць без страт

На парадак дня былі вынесены і іншыя канкрэтныя пытанні: лён, рапс, азімы ячмень і іншыя культуры, якія дазволяць у будучым годзе пачаць уборку ў чэрвені і скончыць яе крыху раней.

Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што трэба годна правесці зімова-стойлавы перыяд. Гэта неабходна, каб атрымаць прадукцыю на тых кармах, якія ёсць, хоць і знізіўшы адну кармавую адзінку.

«Проста трэба карміць як мае быць. Трэба арганізаваць утрыманне жывёлы так, каб на гэтых кармах атрымаць не менш прадукцыі, чым летась. Самае галоўнае — захаванасць жывёлы. Пра што мы часта казалі — падзёж скаціны. Яшчэ раз хачу паўтарыць — гэта пытанне гранічнае з майго пункту гледжання. Тут трэба гарачым жалезам выразаць усе недахопы», — сказаў ён.

• **Каментарый у тэму**

# Дэфіцыту не будзе — гэта аксіёма

**Пасля даклада Прэзідэнту віцэ-прэм'ер Аляксандр СУБОЦІН, які курыруе аграрна-прамысловы комплекс, адказаў на пытанні журналістаў.**

Ён запэўніў, што дэфіцыту ў сельскагаспадарчай прадукцыі не будзе, гэта аксіёма. «Таму што мы вырабляем у шмат разоў больш, чым нам трэба. І таму што ў нас першае — гэта наша ўласная харчовая бяспека і ўнутраны рынак. Гэта канстанта, аксіёма», — падкрэсліў віцэ-прэм'ер.

Аляксандр Субоцін папярэдзіў, што росту цэн не пазбегнуць. І гэта звязана з сусветнай кан'юнктурай, якая расце. «Калі мы пачнём перакрываць, нейк душыць цэны на ўнутраным рынку, а цікавейшая будзе цана ў Расійскай Федэрацыі, людзі будуць купляць тавар і аўтобусамі, машынамі яго перавозіць. Ператок будзе ў любым выпадку», — растлумачыў ён. Тым больш растуць цэны на тавары, якія так ці інакш уплываюць на канчатковы кошт сельгаспрадукцыі, уключаючы ўгнаенні, некаторыя імпартныя камплектуючыя, запчасткі і многае іншае.

«Усё аб'ектыўна расце. Таму мы не зможам дзесьці ўтрымаць цану, не наносячы шкоды вытворцу. Але існуе вялікая колькасць механізмаў, якія нівелююць гэтыя скачкі. У тым ліку і адрасная падтрымка маламаёмасных слаёў насельніцтва, і недзе абмежаванне маржынальнасці, абмежаванне рэнтабельнасці гандлёвых сетак. Усе гэтыя механізмы вядомыя ва ўрадзе, мы іх актыўна выкарыстоўваем. І мы стараемся максімальна стрымліваць рост цэн», — падкрэсліў Аляксандр Субоцін.

## ЭКСПАРТ ПАВЯЛІЧВАЕЦЦА

Паколькі Беларусь не толькі забяспечвае сябе актуальнымі таварамі, але і пастаўляе вялікія аб'ёмы на экспарт, рост сусветных цэн на прадукты харчавання мае для Беларусі і адваротны, пазітыўны, бок. Аляксандр Субоцін разглядае даручэнне Прэзідэнта дасягнуць 7 мільярдаў экспарту як напружаную задачу: «За дзевяць месяцаў гэтага года мы ўжо зрабілі 112,6 % (у адносінах да мінулага года). Гэта каля 4,7 млрд долараў. Сёлета мы перавысім 6 млрд долараў. Ну а 7 мільярдаў — ужо як кан'юнктура будзе складвацца. Але мы пастараемся як мага хутчэй. Мы ідзём да гэтага».

## РЫХТУЙСЯ ДА СЯЎБЫ ВОСЕННЮ

**Міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Іван КРУПКО** падкрэсліў, што хоць 2021 год быў цяжкі праз умовы надвор'я, але склаўся няблага і многія фінансава-эканамічныя паказчыкі выраслі. Паводле яго слоў, аб'ёмы вытворчасці прадукцыі ў раслінаводстве і жывёлагадоўлі на 100 % забяспечваюць патрэбнасці ўнутранага рынку і загрузку перапрацоўчых прадпрыемстваў.

Аграрыі ўжо цяпер пачалі падрыхтоўку да наступнага сезона, каб у 2022 годзе павялічыць ураджай па шэрагу культур. Напрыклад, азімага ячменю пасеялі ў два разы больш — на плошчы 600 тысяч га, на 40 тысяч га павялічылі плошчу сяўбы пшаніцы. Налета стаіць задача выйсці на ўраджай збожжа ў 8 млн т у свірнавой вазе (або 9,5 млн т у бункернай вазе), забяспечыць прырост вытворчасці малака і мяса на ўзроўні 104 працэнтаў, насыціўшы не толькі ўнутраны рынак, але і павялічыўшы экспартны патэнцыял. Акрамя таго, сёлета будуецца або праходзіць рэканструкцыю каля 100 аб'ектаў АПК.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Акцэнты

__Наталля КАЧАНАВА__:

# «ДАВАЙЦЕ ПРАЦАВАЦЬ КАНСТРУКТЫЎНА — БЕЗ ШАНТАЖУ І НАЦІСКУ НА НАС»

**Спікер верхняй палаты парламента сустрэлася з дырэктарам Еўрапейскага рэгіянальнага бюро СААЗ Хансам Клюге. Падчас гутаркі бакі абмеркавалі сітуацыю, якая сёння склалася ў лагеры бежанцаў на беларуска-польскай граніцы.**

— Усё, што адбываецца, не можа нас не хваляваць, бо Беларусь заўсёды добрасумленна выконвала ўсе міжнародныя дамоўленасці адносна міграцыі, — запэўніла яна.

Наталля Качанава падкрэсліла, што беларускія сенатары паглыблены ў гэту тэму, бо з першых дзён па даручэнні кіраўніка краіны ўзялі пад свой кантроль работу па забеспячэнні ўсім неабходным людзей, што апынуліся ў бядзе.

Яна расказала, што на пастаяннай аснове сітуацыю на месцы адсочвае старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар Ліскові, які актыўна працуе там з людзьмі, выконваючы кантроль за іх харчаваннем, пражываннем і аказаннем медыцынскай дапамогі. Спікер верхняй палаты парламента запэўніла госця, што Беларусь ад прынцыпаў добрасуседства, міласэрнасці не адыходзіла ніколі і гатова заўсёды дапамагаць людзям.

— Як гатова і да канструктыўнага супрацоўніцтва, накіраванага на вырашэнне праблем, — падкрэсліла яна.

Разам з тым Старшыня Савета Рэспублікі з жалем канстатавала той факт, што з боку еўрапейскіх краін у адрас Беларусі ідзе іншая рэакцыя — хлусня, фэйкі, ціск. Яна падкрэсліла, што грамадскія арганізацыі, увесь дэпутацкі корпус абураны стаўленнем да нашай дзяржавы з боку еўрапейскіх краін з іх перадузятымі прэтэнзіямі.

— Мы неаднаразова звярталіся ва ўсе еўрапейскія арганізацыі, да сваіх калег — дэпутатаў Еўрапейскага саюза, — але, на жаль, нас не вельмі чуюць, — канстатавала Наталля Качанава.

Яна звярнула ўвагу, што ў тым, што зараз адбываецца на граніцы, місія СААЗ змагла пераканацца самастойна, як і ў тым, што створаны базавыя ўмовы пражывання ў лагістычным цэнтры, у тым ліку і ў плане аказання медыцынскай дапамогі. Толькі ў аўторак (23 лістапада) да ўрачоў, якія працуюць на месцы, звярнуліся 85 чалавек, дзесяці сапраўды спатрэбілася дапамога, на стацыянарным лячэнні знаходзяцца пяць чалавек.

— Аднак у першыя дні, калі развівалася сітуацыя, было жахліва, — згадала Старшыня Савета Рэспублікі. — Мы людзі, якія выраслі ў сэрцы з вайной. У нас бацькі перажылі вайну ў акупацыі, і калі мы ўбачылі, як абыходзяцца з людзьмі на граніцы, ведаеце, па меншай меры, гэта бесчалавечна: распыляюць не проста ваду з вадамётаў, але і ядахімікаты, і людзі ад гэтага пакутуюць.

Яна яшчэ раз акцэнтавала ўвагу: Беларусь заўсёды прытрымлівалася міралюбівай і добрасуседскай палітыкі ў адносінах да іншых краін.

— Наша задача — зрабіць усё магчымае, каб урэгуляваць гэтую сітуацыю мірным шляхам, — сказала Наталля Качанава і звярнула ўвагу на неабходнасць уключэння ў гэтыя працэс усіх міжнародных арганізацый, якія зацікаўлены ў станоўчым вырашэнні праблемы з бежанцамі.

Паводле яе слоў, усе грамадскія арганізацыі Беларусі ўжо далучыліся да аказання гуманітарнай дапамогі:

— Мы накіравалі 70 тон прадуктаў харчавання, адпраўляем цёплыя рэчы, коўдры. Наш прыватны бізнес прадставіў лагістычны цэнтр, дзе размясцілі людзей. Сёння арганізавалі гандаль, абменны пункт, мабільную лазню, каб людзі маглі прытрымлівацца элементарных правіл гігіены, — расказала яна.

Яна падзякавала Хансу Клюге за станоўчую ацэнку работы, якую Беларусь выконвае па пераадольванні наступстваў ковід-інфекцыі, і звярнулася з просьбай як прадстаўніка Сусветнай арганізацыі аховы здароўя:

— Давайце будзем працаваць канструктыўна, — заклікала спікер. — Толькі канструктыўнае супрацоўніцтва без шантажу і націску на нас. Таму што мы нічога супрацьпраўнага не робім, а, наадварот, падставілі плячо гэтым людзям і робім усё, каб яны былі накормлены, знаходзіліся ў цяпле, і мы маглі аказаць ім медыцынскую дапамогу ў выпадку неабходнасці.

Старшыня Савета Рэспублікі выказала пажаданне, каб да гэтай дзейнасці далучыліся і іншыя арганізацыі, падставілі плячо, у тым ліку з фінансавага пункту гледжання:

— Нам паабяцалі, што будуць накіраваныя сродкі, але іх пакуль няма. Таму мы займаемся самі, наколькі гэта магчыма. Але, паверце, у нас наладжана харчовая бяспека нашых грамадзян, і мы не дадзім у крыўду тых, хто сёння патрабуе нашай абароны, — падкрэсліла Наталля Качанава.

Са свайго боку, Ханс Клюге падзякаваў за магчымасць на ўласныя вочы ўбачыць тое, што адбываецца на тэрыторыі лагера бежанцаў і выказаў высокую ацэнку арганізацыі работы.

Падводзячы папярэднія вынікі свайго візіту ў ТЛЦ і бальніцы Гродна, дырэктар Еўрапейскага рэгіянальнага бюро СААЗ Ханс Клюге распавёў, што 25 лістапада ў Беларусь прыбудзе гуманітарны груз, які прадаставіць рэгіянальны офіс СААЗ.

Плануецца, што гэта будзе медыцынская дапамога бежанцам, якія цяпер знаходзяцца ў ТЛЦ на беларуска-польскай граніцы.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

• **Дослоўна**

**Віцэ-прэм'ер Ігар ПЕТРЫШЭНКА, падчас сустрэчы з Хансам Клюге, якая таксама прайшла ўчора, выступіў з наступнай прапановай:**

«Мы прапануем на пазачарговым пасяджэнні Выканкама СААЗ разгледзець тыя абуральныя факты здзеку з бежанцаў, якія былі праяўлены з боку Польшчы, калі яны ў марознае надвор'е палівалі людзей вадой з атрутнымі рэчывамі, прычым на тэрыторыі нашай краіны. Гэтыя людзі не перасякалі дзяржаўную граніцу Польшчы, а там палівалі і жанчын, і дзяцей. Гэтую інфармацыю мы дакументальна дадзім вам, каб у рамках свайго мандата вы разгледзелі тыя здзекі, якія чыняць польскія сілавікі, а можа, і з іншых краін Еўрапейскага саюза. Бежанцаў б'юць, а яны ўсяго толькі спрабуюць знайсці шчасце ў Еўрапейскім саюзе», — адзначыў віцэ-прэм'ер.

«Сітуацыя на граніцы не ініцыяваная намі, яна прыўнесена звонку, але мы, на жаль, вымушаны за свае сродкі і сваімі сіламі рэагаваць і аказваць садзейнічанне ў тым, каб у поўнай меры выконваць абавязацельствы, прынятыя ў СААЗ. Беларускі бок дзейнічае ў тым ліку ў рамках праграмы СААЗ на 2021 год, дзе дакладна прапісана, што трэба забяспечваць здароўе жанчын, дзяцей і падлеткаў, што сістэма аховы здароўя павінна рэагаваць на надзвычайныя сітуацыі. Так вось вам рэальная праверка Сусветнай арганізацыі аховы здароўя ў практычнай плоскасці, гэта канкрэтная сітуацыя. Я заклікаю вас і генеральнага дырэктара СААЗ адрэагаваць і паказаць, што Сусветная арганізацыя аховы здароўя ў рамках свайго мандата якасна і эфектыўна рэагуе», — дадаў Ігар Петрышэнка.

# СЭРЦА Ў ПАДАРУНАК

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сэрца — не першы вопыт трансплантацыі ў Магілёве, перад гэтым была ўжо і трансплантацыя ныркі, іншых органаў. Але менавіта пасля перасадкі сэрца можна казаць смела, што ў Магілёў прыйшла вялікая кардыяхірургія.

— Трэба падзякаваць за гэта і нашым спецыялістам, — адзначае Валерый Малашка. — І ў першую чаргу — галоўнаму ўрачу Магілёўскай абласной клінічнай бальніцы Анатолію Куліку. Я яшчэ помню той момант, калі мы яго пераконвалі перайсці з магілёўскай бальніцы № 1, дзе ён быў намеснікам галоўнага ўрача па хірургіі, загадчыкам сасудзістага аддзялення ў абласную бальніцу. Можна было зразумець яго разгубленасць, бо гэта быў крок у невядомасць. Трэба было ісці ў новы калектыў, станавіцца на яшчэ неспазнаную прафесійную сцежку. Ён прыняў рашэнне, а дзяржава стрымала свае



Фота БелТА.

абавязацельствы. І цяпер у нас ёсць і спецыялісты, і магчымасці.

Аперацыя па перасадцы сэрца — вялікае дасягненне, але трэба працаваць далей — выходжваць чалавека. Яшчэ будуць патрэбны кансультацыі сталічных кардыяхірургаў, кардыятэрапеўтаў, рэанімацыйных службаў, але галоўнае — зроблены першы крок. Для магілёўскіх урачоў гэта вопыт пакуль новы, і яны вытрымалі экзамен на выдатна.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# Адчуць сябе патрэбнымі краіне

**Учора ў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце стартаваў праект «Мінская змена». У ім удзельнічаюць навучэнцы 2-3 курсаў сталічных ВНУ, у тым ліку замежныя студэнты, — усяго 47 хлопцаў і дзяўчат, якія прайшлі адборачныя этапы. На працягу сямі месяцаў яны будуць праходзіць неабходную падрыхтоўку і распрацоўваць інавацыйныя праекты па асноўных напрамках жыццядзейнасці горада з улікам задач і мэт сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі і Мінска на 2021—2025 гады. Найлепшыя будуць рэалізаваныя на практыцы.**

«Вы не толькі далучыцеся да рэалізацыі праектаў і адчуеце сябе патрэбнымі краіне ў канкрэтных відах дзейнасці, але і пранесяце па жыцці завязаныя тут адносіны дружбы і ўзаемаразумення. Гэта застанецца з вамі на доўгія гады, — звярнуўся да моладзі **першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім РЫЖАНКОЎ.** — Тым больш вы з розных ВНУ, будзеце працаваць у розных напрамках — вельмі важна мець такі пласт сяброў і знаёмых, на якіх можна будзе абаперціся».

Ён падкрэсліў, што сам асабіста бачыць у моладзі вялікі патэнцыял, раскрыць які можна толькі ў дыялогу. «Для мяне вашы будучыя праекты — кавалачкі дыялогу моладзі і старэйшага пакалення наконт рэалізацыі тых ці іншых ініцыятыў на карысць Радзімы», — сказаў Максім Рыжанкоў.

Ён адзначыў, што ў рэалізацыі «Мінскай змены» актыўна ўдзельнічаюць Мінгарвыканкам, Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце, дзе можна набрацца практычнага вопыту дзяржаўнай работы. Цікавасць дзяржорганаў у такім праекце вялікая: уклаўшы ў студэнтаў крыху больш, чым проста веды і навыкі па прафесіі (напрыклад, будзе навучальны модуль па кіраўніцкіх навыках), горад, краіна атрымаюць больш канкурэнтаздольных, падрыхтаваных спецыялістаў. «Плануем, што наша з вамі супрацоўніцтва на гэтым не скончыцца, — дадаў Максім Рыжанкоў. — І пастараемся зрабіць усё, каб, удзельнічаючы ў праекце, вы не расчараваліся».

**Паводле БелТА.**

Кантэкст

# ВАРШАЎСКАЕ ЗВЕРСТВА

## Польскія сілавікі закідалі бежанцаў выбухпакетамі

**Беларусь 22 лістапада ў індывідуальным парадку пакінулі 118 бежанцаў, паведаміў начальнік Дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі МУС Аляксей БЯГУН. «Кожны дзень асобам, якія звяртаюцца ў кампетэнтныя органы Беларусі з хадайніцтвамі аб рэпатрыяцыі, мы афармляем адпаведныя дакументы, — паведаміў ён. — Акрамя таго, шэраг пасольстваў, у тым ліку Ірак, Сірыя, арганізоўваюць так званыя эвакуацыйныя рэйсы, што прапануюць сваім грамадзянам, якія апынуліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, вярнуцца на радзіму». Пры гэтым бежанцы не звярталіся да беларускага боку па атрыманне прыстанішча. Паводле слоў Аляксея Бягуна, бежанцы, якія знаходзяцца на беларуска-польскай граніцы, «настойліва жадаюць выехаць у краіны Еўрапейскага саюза».**

### ЭКСПЕРТЫ АДМОВІЛІСЯ АД КАМЕНТАРЫЯЎ

У адпаведнасці з дамоўленасцямі, дасягнутымі ў ходзе кантактаў беларускага боку з Еўрапейскім саюзам, адбыўся двухдзённы візіт у Беларусь экспертаў Еўрапейскай камісіі для ацэнкі сітуацыі з бежанцамі на граніцы. Аб гэтым заявіў **прэс-сакратар МЗС Анатоль ГЛАЗ.**

У рамках візіту адбыліся сустрэчы дэлегацыі ЕС у МЗС Беларусі, а таксама з прадстаўніцтвамі міжнародных арганізацый. У ходзе сустрэч у МЗС даведзена пазіцыя Беларусі аб памылковасці і абсурднасці абвінавачванняў нашай дзяржавы ў штучным стварэнні міграцыйнага крызісу на граніцы з ЕС. Еўрапейскія партнёры праінфармаваны аб намаганнях беларускага боку па аблягчэнні становішча бежанцаў на граніцы шляхам іх пераводу ў цэнтр часовага ўтрымання, аказання неабходнай гуманітарнай і медыцынскай дапамогі, у тым ліку ва ўзаемадзеянні з міжнароднымі арганізацыямі, у першую чаргу з агенцтвамі сістэмы ААН. Звернута ўвага на недапушчальныя з пункту гледжання міжнароднага права і прынцыпаў гуманізму падыходы і метады абыходжання некаторых суседніх краін — членаў Еўрапейскага саюза з бежанцамі на граніцы, у тым ліку прымяненне супраць іх спецыяльных сіл і сродкаў, фізічны гвалт у мэтах недапушчэння траплення ў Еўрасаюз.

Беларускі бок таксама акцэнтаваў увагу на неабходнасці пошуку шляхоў рэалізацыі бежанцамі прыстанішча іх імкнення трапіць у Еўрапейскі саюз. Група тэхнічных экспертаў Еўракамісіі пабывала ўчора ў пункце часовага размяшчэння бежанцаў у транспартна-лагістычным цэнтры на беларуска-польскай граніцы. Вывучыўшы ўмовы ў ТЛЦ, эксперты з'ехалі, адмовіўшыся штосьці каментаваць для прэсы.

Адбылася сустрэча **старшыні Дзяржаўнага пагранічнага камітэта генерал-лейтэнанта Анатоля ЛАПО з рэгіянальным дырэктарам МАМ па краінах Паўднёва-Усходняй і Усходняй Еўропы, а таксама Цэнтральнай Азіі Рэнатай ХЕЛЬД і намеснікам дырэктара Бюро Еўропы УВКБ ААН Анжэлай ЛІ РОСІ.** Аб гэтым паведаміў Дзяржпагранкамітэце. «Бакі разгледзелі бягучую сітуацыю, звязаную з нерэгулярнымі мігрантамі, якія знаходзяцца на граніцы Беларусі і Польшчы. Акрамя таго, абмеркавалі ўзаемадзеянне ўсіх уцягнутых арганізацый для аказання дапамогі гэтай катэгорыі асоб», — расказалі ў ведамстве.

Анатоль Лапо адзначыў, што Дзяржпагранкамітэт адкрыты для дыялогу з усімі зацікаўленымі бакамі. Беларуская пагранічная служба прыкладае максімум намаганняў для вырашэння існуючай сітуацыі з бежанцамі, якія накіроўваюцца ў краіны Еўрасаюза. Па выніках сустрэчы бакі дамовіліся аб далейшым супрацоўніцтве ў гэтым напрамку.

### АЧАГІ НАПРУЖАНАСЦІ

Пакуль у міжнародных стасунках, на жаль, няма канкрэтыкі. Між тым сітуацыя на граніцы застаецца вельмі складанай. Выцясняючы бежанцаў, Польшча стварае ачагі напружанасці на граніцы, заявілі ў Дзяржаўным пагранічным камітэце. «Уначы 23 лістапада група замежнікаў пры спробе выцяснення польскімі сілавікамі адмовілася ехаць у Беларусь і засталася каля польскай загароды, працягваючы прасіць прытулку ў Польшчы. Каб разагнаць бежанцаў, польскія вайскоўцы выкарыстоўвалі выбухпакеты, якія перакідвалі праз лінію граніцы на тэрыторыю Беларусі, і слёзатачывы газ, — расказалі ў ДПК. — Падобныя дзеянні накіраваныя на тое, каб выклікаць зваротную агрэсіўную рэакцыю з боку бежанцаў і стварыць перадумовы для чарговай правакацыі на граніцы».

«Гэта ўжо не першае прымяненне Польшчай спецсродкаў на граніцы адносна бяззбройных людзей. Выкарыстанне польскім бокам выбухпакетаў, святлошумавых гранат, вадамётаў і газу парушае міжнародныя нормы права і з'яўляецца прамой агрэсіяй адносна ўразлівых груп бежанцаў», — дадалі ў Дзяржпагранкамітэце.

### ДВА ТЫПЫ ГРАНАТ

У адносінах да мірных грамадзян на граніцы 16 лістапада выкарыстоўваліся як мінімум два тыпы святлошумавых гранат, адзначыў **старшыня Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Аляксей ВОЛКАЎ,** паведаміла БелТА. Ён растлумачыў, што адзін тып — гэта гранаты, якія маюць святлошумавы эфект, а гранаты другога віду былі таксама начынены слёзатачывым газам. Праведзена больш чым 120 судова-медыцынскіх экспертыз. Прычым звыш 20 экспертыз адносна непаўналетніх, 10 з якіх — малалетнія.

«Калі гаварыць аб тых цялесных пашкоджаннях, якія выяўляюцца пры правядзенні экспертыз, яны розныя. Але для ўсіх характэрны такія праблемы, як пашкоджанне верхніх дыхальных шляхоў, вачэй, слізістай, участкаў скуры, месцамі — апёкі, — сказаў Аляксей Волкаў. — Хачу асабліва адзначыць, што прымяненне такіх моцнадзейных рэчываў, якія мы выявілі ў ходзе правядзення экспертыз, адназначна стварала пагрозу жыццю і здароўю ўсіх людзей, якія знаходзіліся ў зоне паражэння, у зоне распылення гэтых рэчываў».

Разглядаецца версія аб тым, што дзеянні польскіх улад былі загадзя спланаваны. Аб гэтым раней паведаміў **старшыня Следчага камітэта Дзмітрый ГАРА.** Распачата крымінальная справа па факце злачынстваў супраць бяспекі чалавецтва. Пацярпелымі па справе прызнаны 132 чалавекі, больш чым 20 з якіх дзеці.

### АКРЭДЫТАВАНА 22 ЗАМЕЖНЫЯ СМІ

Беларускі бок працягвае прытрымлівацца раней агучанай пазіцыі па ўсебаковым асвятленні падзей, якія адбываюцца каля граніцы. Такое меркаванне выказаў **першы намеснік міністра інфармацыі Андрэй КУНЦЭВІЧ,** паведаміла БелТА. «Акрамя нацыянальных медыя, акрэдытацыю на граніцы атрымалі каля 60 журналістаў з 22 замежных СМІ, якія прадстаўляюць дзевяць дзяржаў. Тым самым беларускі бок прадаўжае прытрымлівацца раней агучанай пазіцыі па ўсебаковым асвятленні падзей, якія адбываюцца каля беларуска-польскай граніцы. Пры гэтым мы бачым, што з польскага боку такой гасціннасці не назіраецца. Польскія ўлады па-ранейшаму абмяжоўваюць або не пускаюць журналістаў для работы на сваёй тэрыторыі, што, на нашу думку, з'яўляецца парушэннем агульнапрынятых сусветных норм і ўзятых польскім бокам міжнародных абавязацельстваў», — адзначыў Андрэй Кунцэвіч. Таксама ёсць падставы лічыць, што афіцыйная Варшава абмяжоўвае прыезд у Беларусь польскіх журналістаў. «Аб гэтым сведчыць той факт, што ніводны польскі СМІ з тых, што ўжо атрымалі акрэдытацыю для работы ў Беларусі, на граніцы так і не з'явіўся», — падкрэсліў Андрэй Кунцэвіч.

**Пётр ДУНЬКО.**

• Тым часам

# МЕРЫ Ў АДКАЗ

Мы вымушаны рэагаваць на ўзмацненне ваеннай актыўнасці па знешнім контуры дзяржграніцы Беларусі. Аб гэтым гаворыцца ў афіцыйнай заяве **начальніка Генеральнага штаба Узброеных Сіл — першага намесніка міністра абароны Беларусі генерал-маёра Віктара ГУЛЕВІЧА,** паведамілі ў прэс-службе абароннага ведамства.

«З 2020 года намі фіксуецца пастаяннае павелічэнне інтэнсіўнасці палётаў разведвальнай і баявой авіяцыі краін-членаў НАТА ўздоўж дзяржграніцы. Так, калі месяц таму агульная колькасць самалёта-вылетаў разведвальнай авіяцыі за суткі складала 2-3, то цяпер гэтая лічба павялічылася амаль у два разы і складае 3—5 самалёта-вылетаў. Інтэнсіўна задзейнічаецца для разведвальных палётаў беспілотная авіяцыя», — заявіў Віктар Гулевіч. Таксама адзначаецца шырокае прыцягненне да выканання разведвальных задач баявой авіяцыі трэціх краін. ВПС ЗША актыўна асвойваюць так званы Усходне-Еўрапейскі тэатр ваенных дзеянняў. Мінімальнае аддаленне маршрутаў іх палётаў ад граніцы Беларусі складае 15—20 км. «Акрамя павелічэння інтэнсіўнасці разведвальнай дзейнасці, істотна павышае ўзровень небяспекі неабгрунтаванае з ваеннага пункту гледжання стварэнне буйных груповак войскаў на тэрыторыі сумежных з намі краін», — сказаў начальнік Генштаба.

Беларусь прадоўжыць прымаць меры па павышэнні абараназдольнасці краіны. «Усё часцей у замежных сродках масавай інфармацыі з'яўляюцца правакацыйныя заявы былых высокапастаўленых ваенных дзеячаў, якія спрабуюць выдаваць сябе за «экспертаў» у пытаннях ваеннага майстэрства. А ў цэлым мы бачым, як насельніцтва Польшчы, Прыбалтыкі і Украіны прывучаюць да думкі аб непазбежнасці вайны. Адказам на правакацыйныя выказванні будзе далейшае павышэнне абараназдольнасці Рэспублікі Беларусь. Мы нарасцім інтэнсіўнасць баявой падрыхтоўкі, прадоўжым выконваць задачы па разведцы для недапушчэння раптоўнага нападзення на нашу дзяржаву», — адзначыў Віктар Гулевіч.

# Бежанцы чакаюць больш кардынальнага вырашэння іх лёсу

**Жыццё ў вымушаных насельнікаў транспартна-лагістычнага цэнтра ў Брузгах паціху наладжваецца. Цяпер яны могуць разлічваць на душ. Для гэтага па распараджэнні абласных улад у аўторак пастаўлены дзве палаткі, што дазволіць людзям памыцца. Да ўчарашняга дня такой магчымасці не было, а некаторыя знаходзяцца ў паходным стане некалькі тыдняў. Аднак бежанцы чакаюць і больш кардынальных вырашэнняў іх лёсу, асабліва ад прадстаўнікоў еўрапейскіх місій.**



Асабліва ажыўлена тут каля палявой кухні: можна набраць кіпеню, падагрэць ежу. Як падказалі вайскоўцы, кухня прывезена амаль адразу пасля засялення бежанцаў у лагістычны цэнтр і мае даволі добры попыт. На двары пахаладала, пайшоў снег. Да кухні часта падыходзяць жанчыны, каб разагрэць ежу сваім дзецям. Побач высіцца куча паколатых дроў. Агонь падтрымліваюць пастаянна. Мыццё бялізны пакуль адбываецца на вуліцы, памытыя рэчы вывешваюцца на металічнай агародџы. Для патрэб мігрантаў устаноўлены дзве цыстэрны з вадой, якая паступае сюды па шлангу з лагістычнага цэнтра. Непадалёку ад імправізаванай кухні днямі можна было бачыць, як аднаму з бежанцаў брыюць нагала галаву.

На тэрыторыю лагера прывезена каля 30 біяпрыбіральняў. Таксама тут размешчаны вялікія кантэйнеры для смецця. За чысцінёй тэрыторыі сочаць самі насельнікі лагера.

З самага ранку ўсе атрымліваюць сняданак — гарачую гарбату і іншыя прадукты: малако, ёгурты, фруктовыя сокі, хлеб. Дзецям выдаюцца кандытарскія вырабы. Многія з іх выходзяць з палатак з каробкамі пячэння, некаторыя не могуць утрымаць ласункі ў руках, таму для рэчаў задзейнічаюць капюшоны.

І ўсё ж відавочна, што настрой людзей далёкі ад ідэальнага. З гэтым пагаджаюцца і студэнткі-валанцёры з філалагічнага факультэта ГрДУ Дзіяна Касьян і Хрысціна Макаўчык, якія працуюць тут у якасці перакладчыкаў некалькі дзён. Яны шмат размаўлялі з бежанцамі, якія валодаюць англійскай мовай, у асноўным гэта мужчыны, маладыя і сярэдняга ўзросту. Тым не менш, на англійскай мове, па іх словах, наогул размаўляе невялікі працэнт бежанцаў.

Дапамога перакладчыкаў стала больш запатрабаванай, калі прыехалі аўталаўкі і фудтрак. Зняцце моўнай перашкоды значна паскарае абслугоўванне. Некаторыя бежанцы праз перакладчыкаў звярталіся па медыцынскую дапамогу. Жанчына пад 60 гадоў з цукровым дыябетам расказала, што ў яе засталася толькі адна таблетка. Але як знайсці цяпер тую жанчыну, невядома, кажуць дзяўчаты. Некаторыя бежанцы дагэтуль звяртаюцца з траўмамі, якія атрымалі падчас вадамётнай і газавай атак з польскага боку 16 лістапада. Многія скардзяцца, што баляць вочы, сталі дрэнна бачыць з-за ўздзеяння газу.

Адзін з бежанцаў расказаў, што ў яго пяцёра дзяцей, усе яны босыя, прасіў дапамагчы іх абуць. Дарэчы, па словах валанцёраў, тут даволі шмат цяжарных жанчын і маленькіх дзяцей. Каб палепшыць зносіны, у лагер з Масквы прыехаў перакладчык з курдскай мовы.

Ад доўгага знаходжання ў такіх складаных умовах у некаторых не вытрымліваюць нервы. Назіраліся сутычкі паміж мігрантамі, адна з іх нават скончылася шпіталізацыяй. Бежанцы, па словах валанцёраў-перакладчыкаў, настроеныя на тое, каб трапіць у Еўрасаюз. Яны нават не хочуць ад'язджаць з лагістычнага цэнтра. У дзіцяці адной з бежанак паднялася высокая тэмпература, але тая ўсё роўна адмовілася ехаць у бальніцу: пайшла нібыта ўзяць рэчы, але так і не вярнулася. Замежныя грамадзяне вельмі насцярожана ставяцца да сітуацыі, калі медыкі пытаюцца ў іх пашпарт — папросту адмаўляюцца яго паказваць. Усе бежанцы не пакідаюць надзеі трапіць праз «зялёны» калідор у Германію.



На тэрыторыі лагера бежанцы не толькі атрымліваюць гуманітарную дапамогу, але і самі могуць штосьці набыць. Некалькі дзён таму сюды пачала прыязджаць аўталаўка, арганізаваная Гродзенскім аблспажыўсаюзам. Паколькі попыт на тавары быў высокі, а чэргі вялікія, вырашылі адправіць яшчэ адну машыну. Цяпер людзей абслугоўваюць дзве аўталаўкі. Прадстаўнікі гандлёвай арганізацыі паведамілі, што карыстаюцца попытам чыпсы, газіраваныя напоі, чай, цукар і нават семкі, кандытарскія вырабы. Таксама купляюць вільготныя сурвэткі, шампуні, мыла. Запатрабаваная тут і вермішэль хуткага прыгатавання. Працуе фудтрак з шаўрмой. Вялікага ажыятажу, як было ў першы дзень работы выязнога гандлю ў Брузгах, ужо няма. Людзі ведаюць, што аўталаўка прыязджае кожны дзень і працуе да 22 гадзін. Гродзенскі аблспажыўсаюз плануе прывозіць уласныя вырабы, напрыклад, піражкі з начынкай. Аб'ём асартыменту фарміруецца з улікам першага дня гандлю. Да аўталавак далучыўся і «Культгандаль». Апошні прывёз цёплыя рэчы, абутак і нават валёнкі. Праўда, для жыхароў усходніх краін гэты абутак невядомы, таму попыту на іх пакуль няма. Затое купляюць шкарпэткі і тэрмабялізну. Многія карыстаюцца пунктам абмену валют.

Беларусы бяруць удзел у дабрачынных акцыях па падтрымцы бежанцаў. З Ваўкавыска, напрыклад, прыбыў аўтобус з прадстаўнікамі пярвічных структур грамадскіх арганізацый буйных прадпрыемстваў горада на чале са **старшынёй раённай арганізацыі Беларускага саюза жанчын Наталляй ЗІНЕВІЧ.** На яе думку, сітуацыя павінна вырашыцца на карысць бежанцаў, якія дастаткова напакутаваліся за гэты час. Добра, што ў іх цяпер ёсць дах над галавой і яны не заспелыя ў лесе марозам і снегам.

З умовамі пражывання бежанцаў азнаёміўся дырэктар Еўрапейскага рэгіянальнага бюро Сусветнай арганізацыі аховы здароўя Ханс Клюге. Ён станоўча ацаніў меры, якія прымаюцца беларускімі ўладамі для арганізацыі быту, харчавання і медыцынскага абслугоўвання бежанцаў.

Як расказаў **старшыня Беларускага Чырвонага Крыжа Дзмітрый ШАЎЦОЎ,** бежанцам раздалі 2,5 тысячы коўдраў. За тыдзень знаходжання ў лагістычным цэнтры імі атрымана 15,5 тон малака, 53,6 тон прадуктовых набораў, якія ўключаюць хлеб, мясныя кансервы, кандытарскія вырабы. Кожны дзень раздаецца не менш за пяць тон прадуктаў. Ёсць неабходны запас на складах. Таварыства Чырвонага Крыжа падтрымлівае сувязь са многімі партнёрскімі арганізацыямі, якія гатовыя падвозіць патрэбныя рэчы. Напрыклад, у панядзелак абласны прафсаюз прывёз дзіцячыя наборы. Трэба сказаць, што мікрааўтобусы з «гуманітаркай» ідуць пастаянна. На працягу толькі аднаго дня іх прыйшло каля дзясятка. Зранку — гэта стала сістэматычнай з'явай — дзецям разам з салодкімі пачастункамі раздаюць цацкі, размалёўкі. Таксама ў палатцы з гуманітарнай дапамогай можна атрымаць падгузкі, іншыя сродкі гігіены.

Такім чынам, бежанцы забяспечаныя жыццёвым мінімумам, які неабходны чалавеку. Але такая сітуацыя не можа доўжыцца бясконца. Ад міжнародных арганізацый чакаюць больш канкрэтных крокаў па яе вырашэнні. У сувязі з гэтым пэўныя спадзяванні ўскладаліся на візіт эксперта Еўракамісіі, якая пабывала ў лагеры бежанцаў 23 лістапада. Група тэхнічных экспертаў азнаёмілася з тым, як жывуць людзі ў транспартна-лагістычным цэнтры. Неабходны каментарый быў дадзены з боку абласных уладаў, падрабязна расказана аб тым, як кормяць людзей, якія ўмовы для іх ствараюцца, як наладжана медыцынскае абслугоўванне. У прыватнасці, **намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар ПРАНЮК** паведаміў, што ёсць і гарачае харчаванне, для дзяцей і жанчын выдзелена асобная палатка, кругласутачна дзяжураць дзве брыгады хуткай дапамогі. Штодзень у медыкаў кансультуецца ад 40 да 70 чалавек. На дадзены момант у бальніцах Гродна знаходзяцца трое дзяцей і двое дарослых бежанцаў. Ёсць сярод іх адзін выпадак каранавіруснай інфекцыі. Праўда, ён выяўлены не ў самім лагеры — хворага даставілі ў медустанову са Шчучынскага раёна. Людзям аказваецца і псіхалагічная дапамога.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

*КПП «Брузгі», Гродзенскі раён.*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У выніку аўтакатастрофы ў Балгарыі загінулі 46 чалавек



Аўтобус, які трапіў у аварыю і згарэў на трасе ў Балгарыі, вяртаўся з экскурсійнай паездкі ў Турцыю, паведаміла балгарскае выданне Tribune. Паводле інфармацыі тэлеканала NOVA, жудаснае здарэнне адбылося на аўтамагістралі каля вёскі Боснек у Пернікскай вобласці на захадзе Балгарыі, усе загінулыя — грамадзяне Паўночнай Македоніі. МУС Балгарыі паведаміла, што загінулі 46 чалавек, у тым ліку 12 дзяцей. Усяго ў аўтобусе, паводле розных звестак, знаходзілася 52 чалавекі. Кіраўнік МУС Балгарыі Бойка Рашкаў паведаміў, што від аварыі жахлівы: «Я такога яшчэ не бачыў, людзі ўнутры поўнасцю згарэлі». Пры гэтым дырэктар Нацыянальнай следчай службы Балгарыі Барыслаў Сарафаў заявіў, што целы ахвяр згарэлі да непазнавальнасці, апазнаць іх можна будзе, верагодна, толькі па ДНК. Паводле яго слоў, асноўнымі версіямі аварыі застаюцца чалавечы фактар і тэхнічная няспраўнасць.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў сувязі з трагедыяй ад імя беларускага народа і сябе асабіста выказаў спачуванні народу Паўночнай Македоніі, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

### Спецдакладчык ААН назваў ЗША нацыяй парадоксаў

Спецыяльны дакладчык ААН па пытаннях меншасцяў Фернан дэ Варэн заклікаў ЗША мадэрнізаваць сваё заканадаўства, каб не дапускаць дыскрымінацыі. У заяве, распаўсюджанай у Жэневе, ён назваў Злучаныя Штаты нацыяй парадоксаў у сферы правоў чалавека, падкрэсліўшы, што «мільёны амерыканцаў, асабліва меншасці, сутыкаюцца з ростам няроўнасці, дыскрымінацыяй і нават непрыманнем», паведамляе ТАСС. «ЗША вылучаюцца сярод заходніх дэмакратый сваёй незавершанай мазаікай прызнання правоў чалавека і іх прававой абароны», — адзначыў дэ Варэн па выніках свайго 14-дзённага візіту ў Злучаныя Штаты. У гэтай краіне «ў часы ўзрушэнняў, нявызначанасці і крызісаў меншасці і карэнное насельніцтва з вялікай верагоднасцю аказваюцца забытыя». Гэтыя «недахопы ў сферы правоў чалавека» выявіліся ў апошнія гады, калі «фенаменальна вырасла прапаганда нянавісці ў сацыяльных медыя» і «ўзмацнілася няроўнасць паміж багатымі і небагатымі».

### Колькасць мігрантаў, якія даплылі да Вялікабрытаніі, патроілася

Колькасць нелегальных мігрантаў, якія дабраліся да Вялікабрытаніі на лодках, пераадолеўшы Ла-Манш, сёлета ўтрая перавысіла паказчык 2020-га. Як паведаміла брытанскае міністэрства ўнутраных спраў, толькі за мінулую суботу да берагоў Англіі дабраліся 886 чалавек, і такім чынам агульная колькасць нелегальных мігрантаў склала 25,7 тысячы. За мінулы год іх было 8469. 11 лістапада быў устаноўлены рэкорд: 1185 прыбылі морам за адзін дзень. Пры гэтым у цэлым паток нелегалаў — тых, каго выяўляюць улады — не расце, проста з-за брэксіту і пандэміі мігранты і кантрабандысты, якія іх перапраўляюць, пераключыліся з іншых спосабаў пранікнення ў краіну на небяспечную пераправу праз мора ў лодках. Па няпоўных афіцыйных ацэнках, у апошнія некалькі тыдняў пры спробе перапраўціцца з Францыі ў Брытанію загінула як мінімум 10 чалавек. Вялікабрытанія нават вылучыла Францыі 63 млн еўра на ахову марской граніцы.

# Узбекскае шчасце...

## У чым яно?

**Беларусь — Узбекістан: дзве незалежныя дзяржавы, далёкія адна ад адной геаграфічна, але блізкія гістарычна, палітычна і эканамічна. У апошнія гады ўзаемаадносіны паміж нашымі краінамі прыкметна актывізаваліся. У аснове плённага супрацоўніцтва, перш за ўсё, дружалюбныя адносіны і асабістыя кантакты лідараў абедзвюх краін. Узбекістан сёння — гэта краіна, якая дынамічна развіваецца і ў якой гарманічна перапляліся ўсходні каларыт і сучаснасць. Чаму кожны беларус хоць бы раз у жыцці павінен пабываць ва Узбекістане? Пра палітыку, эканоміку, турызм і простае ўзбекскае шчасце карэспандэнт «Звязды» пагутарыла з часовым павераным у справах Рэспублікі Узбекістан у Рэспубліцы Беларусь Рахматулой Джурабаевічам НАЗАРАВЫМ.**

***— Узбекістан сёння і пяць гадоў таму. Мы ў Беларусі бачым: пазітыўныя змены відавочныя. Наколькі моцны і ў якіх сферах адбыўся рух наперад?***

— Змены вельмі дынамічныя. За пяць гадоў мы дасягнулі вялікіх вышынь ва ўсіх кірунках — няхай гэта будуць палітычныя адносіны, эканоміка ці сацыяльная сфера. Усюды ідзе інтэнсіўная і карпатлівая работа, у першую чаргу нацэленая на тое, каб ва Узбекістане наладзілася жыццё, каб народ жыў дастойна, каб з суседзямі мы сябравалі. Усё для таго, каб заняць дастойнае месца сярод сусветных дзяржаў.

Для прыкладу возьмем нашы ўзаемаадносіны з адным з найбліжэйшых суседзяў Таджыкістанам. Паміж суседзямі заўсёды ёсць нейкія пытанні. У нашым выпадку гэта агульная граніца, водна-энергетычныя праблемы. Усё тое, што не магло знайсці вырашэння на працягу 20 гадоў, за апошнія пяць гадоў гэтае вырашэнне атрымала. Уявіце сабе, да 2017 года паміж Узбекістанам і Таджыкістанам існаваў візавы рэжым. Але ж па абодва бакі граніцы часта жывуць сваякі, якія не могуць паўнацэнна кантактаваць. Дзякуючы палітычнай волі нашага кіраўніка, удалося адмяніць візавы рэжым.

Што да міжнароднага характару ўзаемаадносін, то тут таксама адбыўся прарыў. Былі перагледжаны ўзаемаадносіны і дасягнута ўзаемаразуменне не толькі з найбліжэйшымі, але і з далёкімі суседзямі.

Доўгі час я прадстаўляў інтарэсы Рэспублікі Узбекістан у СНД. За апошнія пяць гадоў тут таксама адбыліся пазітыўныя для нас змены. Калі раней Узбекістан браў непасрэдны ўдзел у абмеркаванні 30 % пытанняў таго ці іншага пасяджэння, то цяпер гэты ўдзел роўны 100 %. Усе дакументы, якія датычацца Садружнасці, наш бок падпісвае поўнасцю. Акрамя таго, Узбекістан сёння прадстаўлены ва ўсіх статутных і галіновых органах СНД.

Вядома, сёння перад Узбекістанам стаіць задача не абмяжоўваца адным напрамкам узаемадзеяння, а развіваць канструктыўныя адносіны з усімі дзяржавамі. Калі мы гаворым пра канцэпцыю знешняй палітыкі Узбекістана, то прыярытэце — дзяржавы Цэнтральна-Азіяцкага рэгіёна, Расія, краіны СНД. Акцэнт — на супрацоўніцтве на карысць нашых народаў. Таксама наладжваецца ўзаемадзеянне з ЗША, ЕС, краінамі Афрыкі і Лацінскай Амерыкі. Выбудоўваем адносіны, найперш, зыходзячы з нашых эканамічных інтарэсаў.

***— Не магу не спытаць пра тое, як сёння складваюцца адносіны Узбекістана з Афганістанам пасля прыходу да ўлады талібаў?***

— Кантакты з талібамі ўсталяваліся даўно. Нягледзячы на новы палітычны рэжым у краіне-суседзі, наша задача, перш за ўсё, у тым, каб наладжваць эканамічнае ўзаемадзеянне. У сувязі з гэтым уцягваем нашых суседзяў у эканамічныя праекты. Узбекістан — гэта адна з дзвюх дзяржаў у свеце, якая, не маючы выхаду да мора, мае суседзяў, якія таксама не маюць выхаду да мора. На англійскай мове гэта гучыць так: double land locked country. Каб ажыццявіць выхад да мора, нам неабходна пракладваць транспартныя магістралі. Зыходзячы з гэтай патрэбы, у свой



час быў рэалізаваны праект па будаўніцтве чыгункі з Узбекістана да афганскага горада Мазары-Шарыф. Цяпер ідзе абмеркаванне праекта па прадаўжэнні гэтай веткі да Карачы ў бок граніцы з Пакістанам. Афганскі бок выказвае інтарэс у гэтым пытанні, бо праект мае стратэгічнае значэнне для ўсіх зацікаўленых бакоў. Акрамя таго, паміж Узбекістанам і Афганістанам ажыццяўляецца цеснае ўзаемадзеянне ў энергетычных пытаннях.

***— Нядаўна ва Узбекістане прайшлі прэзідэнцкія выбары. Грамадзяне краіны пацвердзілі жаданне бачыць Шаўката Мірзіёева на чале дзяржавы яшчэ на працягу пяці гадоў. На ваш погляд, пра што гэта гаворыць?***

| 238 | Кран подвесной однобалочный 5 тс рег. № 20 | | |
| **Начальная цена лота № 1 без учета НДС – 4 397 590,61 бел. руб. Минимальная цена лота № 1 без учета НДС – 2 638 554,37 бел. руб.** | | | |
| **Лот № 2 Адрес: Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, 98/3, район аг. Гатово** | | | |
| 1035 | **Пристройка к зданию гаража** (назначение: пристройка к зданию автогаража, инв. № 600/С-103714, общ. пл. 14,7 кв. м) | | |
| Составные части и принадлежности | | | |
| 1033 | Открытый склад с площадкой | | |
| 29 | Кран козловой К-09 с подкрановыми путями | | |
| 1022-1 | Ограждение металлическое, ж/бетонное и с колючей проволокой (3 ворот) | | |
| - | Зеленые насаждения в кол-ве 8 шт. | | |
| **Начальная цена лота № 2 без учета НДС – 157 522,20 бел. руб. Минимальная цена лота № 2 без учета НДС – 94 513,32 бел. руб.** | | | |
| **Лот № 5 Адрес: Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, 98/8, район аг. Гатово** | | | |
| **Здание электроремонтного цеха** (назначение: здание специализированное иного назначения, инв. № 600/С-69413, общ. пл. 2 825,6 кв. м) в составе | | | |
| 740 | **Здание электроремонтного цеха** (пристройка – 2-этажное служебное помещение) | | |
| 756 | Здание электроремонтного цеха (цех по производству ТНП) | | |
| 742 | Здание электроремонтного цеха (теплопункт, АБК) | | |
| | **Зеленые насаждения в кол-ве 14 шт.** | | |
| ***Оборудование, входящее в состав лота*** | | | |
| 10036 | Котел твердотопливный, стальной, пеллетный Metal-Fasch SEG BIO-75/FL310Z (правый) | 1283 | Электроводонагреватель аккумуляционный с термоизоляцией ЭВА-450/15 |
| 507 | Линия связи | 166 | Кран подвесной электрический однобалочный г/п 3.2 тс рег. номер 13 |
| 142 | Кран мостовой опорный однобалочный г/п 3.2 тс рег. номер 17 | 240 | Кран мостовой однобалочный 2 тс рег. № 22 |
| 113 | Кран подвесной электрический однобалочный г/п 1тс рег. номер 6 | 167 | Кран подвесной электрический однобалочный г/п 3.2 тс рег. номер 14 |
| 110 | Кран подвесной электрический однобалочный г/п 3.2 тс рег. номер 12 | 168 | Кран подвесной электрический однобалочный г/п 3.2 тс рег. гомер 15 |
| 1284 | Электроводонагреватель аккумуляционный с термоизоляцией ЭВА-450/15 | 280 | Кран мостовой однобалочный 3 тс рег. № 26 |
| **Начальная цена лота № 5 без учета НДС – 779 668,58 бел. руб. Минимальная цена лота № 5 без учета НДС – 467 801,15 бел. руб.** | | | |

**Обременения:** площади зданий лотов №№ 1, 2, 5 частично сданы в аренду. Более подробную информацию по залогу и арендаторам можно узнать у организатора аукциона. На территории лота № 1 расположено защитное сооружение гражданской обороны, которое не входит в состав лота

**Предмет аукциона: оборудование, бывшие в употреблении. Местонахождение: Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, 98, район аг. Гатово**

| № лота | Инв. № по бух. учету | Наименование | Начальная цена без учета НДС*, бел. руб. | Минимальная цена лота без учета НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 6 | 634 | **Пресс гидравлический ПО-930М** | 2 700,00 | 1 620,00 |
| 7 | 509 | **Станок координатно-расточной 2455ФА-1** | 4 100,00 | 2 460,00 |
| 8 | 191 | **Станок токарно-винторезный СПА8/2000** | 2 200,00 | 1 320,00 |
| 9 | 189 | **Станок токарно-карусельный КНА110/135** | 15 700,00 | 9 420,00 |
| 10 | 1341 | **Теплогенератор стационарный SP100C** | 5 600,00 | 3 360,00 |
| 11 | 10017 | **Установка для лазерной резки металла Bystar 3015, 4400 Вт, с системой ЧПУ** | 106 000,00 | 63 600,00 |
| 12 | 10018 | **Установка для лазерной резки металла Bystar 3015, 4400 Вт, с системой ЧПУ** | 35 300,00 | 21 180,00 |
| 13 | 245 | **Тележка моторная П-614** | 830,00 | 498,00 |
| 14 | 242 | **Тележка моторная рельсовая П-614** | 830,00 | 498,00 |

**Лот № 15**

**Принадлежности к горизонтально-расточному станку WRD-150Q** в составе: поворот. стол типа S 30, планшайба LD 650, головка фрезер. универс. ручная HUR 50, зажимные плиты UD 4 – 2 шт., установка для охлаждения инструментов с подачей охлаждающей жидкости осью шпинделя и внешней (охлаждение осью шпинделя) CHOV 150 WRD, конвейер стружки, Pickup станция SZP 2 WRD для автоматич. установки фрез. головки HUR 50 и планшайбы LD 50 на торец ползуна станка, направляющие опоры длинная PVD 150- 550 R и короткая PVK 150-300, зажим. угольники UU 800-UU 4500 – 2 шт.

**Начальная цена лота № 15 без учета НДС – 686 900,00 бел. руб. Минимальная цена лота № 15 без учета НДС – 412 140,00 бел. руб.**

| | |
|---|---|
| **Условия самовывоза и демонтажа оборудования** | Демонтаж, разборка, погрузка и транспортировка предмета аукциона проводится за счет покупателя. Продавец и организатор аукциона не оказывают услуг по демонтажу и вывозу предмета аукциона |
| **Размер шага составляет 5 (пять) процентов от цены за лот, складывающийся в ходе электронных торгов** (по всем лотам) | |
| **Порядок ознакомления** | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом аукциона осуществляется в рабочие дни. Ответственное лицо: Михаил, тел. +375 29-256-64-88 |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в ОАО «Белинвестбанк» (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **5 (пять)** рабочих дней после проведения аукциона |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | |
| Предмет аукциона должен быть оплачен покупателем (претендентом на покупку) в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения аукциона | |
| **Порядок оформления участия в торгах, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов определяется Постановлением Министерства экономики № 9 от 1 апреля 2019 года «Об электронных торгах по продаже имущества в процедурах экономической несостоятельности (банкротства)».** Последующая регистрация имущества в качестве капитального строения проводится Покупателем за свой счет в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Указом Президента Республики Беларусь № 63 от 05.02.2013 «О некоторых вопросах правового регулирования процедур экономической несостоятельности (банкротства)». Государственная регистрация договора купли-продажи и объектов недвижимости осуществляется Покупателем за свой счет в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь | |
| Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить продавцу и организатору торгов затраты на их проведение и оплатить организатору торгов установленное вознаграждение от 0,5 % до 10 % от итоговой цены продажи предмета аукциона, указанных в информации об аукционе на сайте www.ipmtorgi.by, в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте www.cpo.by | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов – 27.12.2021 в 09.00. Окончание торгов – 27.12.2021 в 16.00** |
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются с 9.00 24.11.2021 по 24.12.2021 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** |

Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Згубная звычка

# Такая шкодная «гульня»

## Электронныя цыгарэты таксама нясуць небяспеку анкалогіі

**Курэнне становіцца прычынай больш чым 18 разнавіднасцяў анкалагічных захворванняў. Пра гэта расказала загадчыца аддзела грамадскага здароўя і сацыяльна-гігіенічнага маніторынгу Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Анастасія КОСАВА.**

— Ва ўсіх дзяржавах, якія далучыліся да рамачнай канвенцыі па барацьбе супраць тытуню СААЗ, а гэта 182 краіны, праходзяць шырокамаштабныя акцыі, прысвечаныя прафілактыцы ўжывання тытунёвай і нікацінзмяшчальнай прадукцыі. І мы бачым эфект ад гэтай дзейнасці, — адзначыла яна.

Напрыклад, у 2020 годзе распаўсюджанасць ужывання тытунёвай прадукцыі ў Беларусі знізілася да 27,6 %. Гэта адзін з найніжэйшых паказчыкаў у гісторыі краіны. З кожным годам колькасць людзей, якія не пачалі курыць або адмовіліся ад гэтай звычкі, павялічваецца.

Аднак расслабляцца пакуль рана. Небяспека ў тым, што сёння на рынку з'яўляюцца новыя рэчывы — электронныя сістэмы дастаўкі нікаціну, так званыя электронныя цыгарэты. Вытворцы рэкламуюць дадзеную прадукцыю з пазіцыі зніжэння рызыкі ўжывання.

— Гэта ствараe ў маладога пакалення адчуванні нейкай гульні, а не шкоднай звычкі або залежнасці. Цэлы пул экспертаў на працягу апошніх гадоў аналізаваў новую прадукцыю на ўтрыманне шкодных рэчываў. У выніку было выяўлена, што там, акрамя рэчываў, якія прысутнічаюць у класічных тытунёвых вырабах, ёсць яшчэ і тыя, што выдзяляюцца непасрэдна ад сістэм падачы нікаціну.

Анастасія Косава адзначыла, што, паводле апошніх звестак, нікацін можа выклікаць рэзістэнтнасць да інсуліну, такім чынам, з'яўляецца фактарам рызыкі развіцця цукровага дыябету. Ёсць даследаванні і аб тым, што нікацін можа прыводзіць да паніжэння шчыльнасці касцявой тканкі.

— Калі мы гаворым аб новых формах дастаўкі нікаціну, небяспека анкалогіі нікуды не сышла, — распавяла спецыяліст. — Акрамя таго, СААЗ прэзентавала даныя, па якіх відаць, што і на каранавірусы курцы хварэлі часцей, з ускладненнямі, калі патрабавалася штучная вентыляцыя лёгкіх. У тым ліку і колькасць смерцяў ад ковіду ва ўсім свеце была вышэйшая сярод курцоў.

Спецыяліст падказала некаторыя варыянты адмовы ад згубнай звычкі. Напрыклад, папрасіць знаёмых ці сяброў падтрымаць у імкненні змяніць лад жыцця. Змяніць алгарытм сваіх дзеянняў: калі ў звычку ўвайшло курыць, пакуль ідзеш на работу, змяніць маршрут. Калі чалавек спрабаваў кінуць раз, іншы, але нічога не выйшла, варта звярнуцца да спецыялістаў наркалагічных цэнтраў.

Несалодкая хвароба

# ДЫСТАНЦЫЙНАЯ КАНСУЛЬТАЦЫЯ І АБАВЯЗКОВАЯ ВАКЦЫНАЦЫЯ

## Як дапамагаюць пацыентам з цукровым дыябетам падчас пандэміі

**Сацыяльны партрэт пацыента з цукровым дыябетам выглядае наступным чынам: найчасцей гэта дарослы чалавек з цукровым дыябетам 2-га тыпу. У жанчын гэта захворванне сустракаецца ў два разы часцей, чым у мужчын, прычым у 78 % выпадкаў гэта жанчына ў пенсійным ўзросце.**

**Паводле звестак Міжнароднай дыябетычнай федэрацыі, колькасць хворых на цукровы дыябет у свеце летась перавысіла 463 мільёны чалавек. На яго хварэе кожны 11-ты. У нашай краіне на пачатак гэтага года пад назіраннем знаходзілася амаль 357 тысяч пацыентаў. З іх каля 19 тысяч маюць дыябет 1-га тыпу, у астатніх — дыябет 2-га тыпу. Як аказваецца дапамога такім хворым, у прыватнасці, у перыяд пандэміі COVID-19, у тым ліку як атрымаць кансультацыю ўрача-эндакрынолага дыстанцыйна і ці трэба прышчапляцца людзям з цукровым дыябетам, расказалі спецыялісты.**

### У 2025 годзе ўсе пацыенты будуць атрымліваць інсулін у картрыджах

— Павелічэнне хворых на дыябет ва ўсім свеце патрабуе ўсё большых затрат. Сёлета спаўняецца 100 гадоў з моманту адкрыцця інсуліну, нягледзячы на гэта, ён і іншыя прэпараты для лячэння дыябету застаюцца недаступнымі для многіх пацыентаў ва ўсім свеце, — адзначае **Вольга САЛКО, намеснік галоўнага ўрача па арганізацыйна-метадычнай рабоце Рэспубліканскага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння, галоўны пазаштатны спецыяліст па эндакрыналогіі Міністэрства аховы здароўя.** — У нашай краіне аказанне дапамогі хворым на дыябет з'яўляецца важным прыярытэтам дэмаграфічнай палітыкі. Усе лекавыя сродкі, якія ўваходзяць у спіс Міністэрства аховы здароўя, даюцца пацыентам бясплатна — за кошт рэспубліканскага і мясцовага бюджэтаў. Сёння інсулінатэрапію выкарыстоўвае больш за 83 тысячы беларусаў, якія пакутуюць на цукровы дыябет 1-га і 2-га тыпу.

Спецыяліст паведаміла, што летась Міністэрства аховы здароўя зацвердзіла канцэпцыю забеспячэння інсулінамі пацыентаў з цукровым дыябетам. У адпаведнасці з ёй, да 2025 года ўсё пацыенты, якія маюць патрэбу, павінны атрымліваць яго ў картрыджнай форме. Як вядома, яна з'яўляецца нашмат больш зручнай, чым флаконная. Сёлета яшчэ больш за чатыры тысячы пацыентаў з дыябетам 1-га тыпу забяспечаны інсулінамі ў картрыджах. У наступным годзе плануецца, што яго атрымаюць усе пацыенты з дыябетам 1-га тыпу. А да 2025 года ўсе пацыенты, у тым ліку і 2-га тыпу, будуць атрымліваць інсулін у картрыджах.

Міністэрства аховы здароўя пашырыла спіс аналагаў інсуліну, сёлета імі забяспечаны ўсе дзеці з дыябетам 1-га тыпу. Таксама іх атрымлівае і каля 50 % дарослых з дыябетам 1-га тыпу.

— Інсулінатэрапія і прызначэнне цукрапаніжальных прэпаратаў — не адзіны кампанент лячэння. Адным з важных элементаў з'яўляецца тэрапеўтычнае навучанне пацыентаў. Кожны з іх павінен ведаць, як вымяраць дозу інсуліну, як яе вылічыць на порцыю ежы, як гэта суадносіцца з фізічнай актыўнасцю. Рух па стварэнні школ дыябету быў у нашай краіне, напэўна, самы першы, сёння іх дзейнічае 225. Але нам патрэбны новыя формы для работы. Летась было прынята рашэнне па аптымізацыі школ дыябету. Яно супала з нашымі новымі эпідэміялагічнымі ўмовамі, і мы змаглі ўкараніць дыстанцыйную форму. Сёння яна шырока выкарыстоўваецца і ў нашым цэнтры, і ў гарадскім эндакрыналагічным дыспансеры.

Сярод прыярытэтных задач Вольга Салко назвала далейшую рэалізацыю канцэпцыі інсулінатэрапіі, забеспячэнне пацыентаў якаснымі сучаснымі відамі інсуліну, павышэнне якасці работы школ дыябету, паляпшэнне пераемнасці з сумежнымі спецыялістамі, у прыватнасці ўрачамі агульнай практыкі па раннім выяўленні цукровага дыябету 2-га тыпу, і арганізацыю раённых цэнтраў па раннім выяўленні дыябеталагічных ускладненняў.

### За 10 гадоў колькасць хворых вырасла ўдвая

На пачатак гэтага года зарэгістравана 289 тысяч мінчан з хваробамі эндакрыннай сістэмы, з 285 тысяч — дарослыя, паведаміла **Алена ЮРЭНЯ, галоўны ўрач Мінскага гарадскога клінічнага эндакрыналагічнага цэнтра.** Эндакрынная паталогія рэгіструецца ў 18 % мінчан. Прычым сярод людзей, якія яе маюць, 62 % — пацыенты з цукровым дыябетам. У цэлым жа тэндэнцыя не абнадзейвае: у Мінску, як і ў краіне, і свеце, рэгіструецца рост выпадкаў цукровага дыябету. За апошнія 10 гадоў колькасць пацыентаў падвоілася. Калі ў 2010 годзе ў сталіцы іх было зарэгістравана 44,5 тысячы, то на пачатак 2021 года — больш за 83 тысячы.

У цэлым распаўсюджанасць цукровага дыябету сярод жыхароў Мінска складае 5,1 %, па краіне — 4,5 %, у Еўропе — 6,3 %.



— Па Мінску мы недапрацоўваем у плане выяўлення цукровага дыябету, — кажа Алена Юрэня. — Асабліва нас засмуціў 2020 год: прагназавана знізілася колькасць выяўленых новых выпадкаў. Зарэгістравана 6292 новыя пацыенты, а ў 2019-м іх было 7767. Такім чынам, амаль 1,5 тысячы пацыентаў з цукровым дыябетам у 2020 годзе з-за зніжэння зваротаў у медустановы і адмены медаглядаў засталіся нявыяўленымі. Знайсці такіх пацыентаў нам мусяць дапамагчы ўрачы агульнай практыкі, каб як мага хутчэй пачаць лячэнне.

Па інфармацыі галоўнага ўрача гарадскога эндакрыналагічнага цэнтра, нягледзячы на тое, што вялікая колькасць урачоў летась аказвала дапамогу пацыентам з COVID-19, у Мінску эндакрыналагічная дапамога ні на дзень не спынялася. У параўнанні з 2019 годам колькасць наведванняў у Мінску знізілася ўсяго на 16 % і склала 382 тысячы.

### Аддаленае кансультаванне і электронны рэцэпт

Нягледзячы на гэта, медыкам давялося змяніць фармат работы падчас пандэміі і многае рабіць аддалена. У прыватнасці, з'явілася магчымасць дыстанцыйнага кансультавання пацыентаў, якія раней звярталіся ў цэнтр, інфармацыя пра гэта ўносіцца ў амбулаторную карту пацыента. Заяўку на такую кансультацыю можна падаць праз сайт цэнтра. У выпадку, калі пацыент, у першую чаргу гэта датычыцца тых, хто знаходзіцца на дыспансерным назіранні, не з'явіўся на прыём на працягу месяца, яму тэлефануе медсястра і прапануе запісацца для планавага наведвання да ўрача-эндакрынолага.

Усім, хто запісаўся на прыём, таксама тэлефануе медыцынская сястра і пытаецца пра мэту наведвання. Магчыма, гэта ўсяго толькі выпіска рэцэпта, што можна зрабіць і без візіту ў цэнтр. Ва ўсіх урачоў цэнтра сёння маецца магчымасць выпісваць электронныя рэцэпты, за выключэннем інсуліну, дзе патрабуецца папяровы аналаг.

— Калі ў стацыянары ў пацыента выяўляецца гіперглікемія, то яму не патрэбна накіраванне ўрача, ён адразу можа звяртацца ў наш цэнтр, мы атрымліваем яго эпікрыз. Калі рэгіструецца ўпершыню выяўлены цукровы дыябет, які мае патрэбу ў інсулінатэрапіі, то пацыент забяспечваецца рэцэптамі на інсулін адразу на тры месяцы. Не заўсёды гэта інсулінатэрапія пастаянная, і гэта карэкцыруе ўрач-эндакрынолаг. Калі неабходна выпіска рэцэпта за поўны кошт ці льготныя рэцэпты, у той жа дзень перадаецца кансультатыўнае заключэнне ў тэрытарыяльную паліклініку, і яна забяспечвае далейшае назіранне такіх дыспансерных пацыентаў, — расказвае Алена Юрэня.

Загадчыкі аддзяленняў гарадскога эндакрыналагічнага цэнтра штодзённа праводзяць прамыя лініі — па дзве гадзіны штодзень у першую і другую змены. Інфармацыя аб іх маецца на сайтах цэнтра і тэрытарыяльных паліклінік. Ёсць на сайце рубрыка «пытанне — адказ», штодзень урач-эндакрынолаг адказвае на ўсе пытанні.

### Большасць дзяцей атрымлівае аналагі інсуліну

— На сёння пад назіраннем дзіцячых урачоў-эндакрынолагаў знаходзіцца 1606 дзяцей і падлеткаў, каля 98 % з іх з дыябетам 1-га тыпу. Хоць у дзяцей і падлеткаў пачынаюць дыягнаставацца выпадкі дыябету 2-га тыпу — як мы называем яго, «бабулін дыябет», які характэрны для дарослых, — расказвае **Наталля АКУЛЕВІЧ, дзіцячы ўрач-эндакрынолаг Рэспубліканскага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння.** — На сёння ў нашай краіне ёсць магчымасць дыягнаставаць і іншыя тыпы цукровага дыябету, хоць мы яшчэ і ў пачатку гэтага шляху. Усе дзеці з цукровым дыябетам 1-га тыпу атрымліваюць інсулінатэрапію, прычым у нас ёсць магчымасць з моманту маніфестацыі прызначаць і падбіраць аналагі інсуліну. Існуе выбар прэпаратаў, прапануюцца розныя варыянты аналагаў.

Дзіцячыя эндакрынолагі з'яўляюцца першымі ў развіцці сучасных метадаў дапамогі пацыентам з цукровым дыябетам. Гэта і новыя спосабы самакантролю з выкарыстаннем сістэм бесперапыннага маніторынгу гіпаглікеміі, і новыя формы лячэння дыябету з выкарыстаннем розных варыянтаў інсулінавых помпаў.

У цэнтры праводзіцца ўстаноўка інсулінавых помпаў дзецям з усёй краіны, у тым ліку і з Мінска. Юных пацыентаў урачы вядуць з моманту ўстаноўкі помпы, вучаць, як ёй карыстацца, карэкцыруюць інсулінатэрапію. Важна, што ўстаноўка помпы ажыццяўляецца без шпіталізацыі.

### Вакцынацыя ў прыярытэце

Рызыка цяжкага ходу інфекцыі COVID-19 павышаецца ў тры разы ў пацыентаў з цукровым дыябетам, што пераканаўча даказана ў рамках навуковых даследаванняў, кажа **прафесар кафедры эндакрыналогіі БДМУ, старшыня Беларускага грамадскага медыцынскага аб'яднання «Эндакрыналогія і метабалізм», доктар медыцынскіх навук Ала ШЭПЯЛЬКЕВІЧ.** Паколькі 98 % людзей з цукровым дыябетам пакутуюць на атлусценне, варта звярнуць увагу на лішнюю вагу.

— Пытанне вакцынацыі важнае для людзей з цукровым дыябетам. Гэта група пацыентаў лічылася прыярытэтнай у адносінах вакцынацыі ад грыпу і яшчэ сямі хвароб. Усе міжнародныя арганізацыі рабілі акцэнт на тое, што пацыенты з дыябетам перш за ўсё павінны быць прышчэплены. З калегамі-інфекцыяністамі, эпідэміёлагамі мы шмат абмяркоўваем гэтыя пытанні і прыйшлі да высновы, што найлепшая стратэгія ва ўсім свеце — вакцынацыя. Наша пазіцыя — адносіць пацыентаў з цукровым дыябетам да прыярытэтнай групы, — падкрэслівае спецыяліст.

Хто каго?

# «ЁН НА ТОЕ І ЛІПЕНЬ, КАБ ДА ДЗЕВАК ЛІПНУЦЬ...»



**Што было — было: справа жыццёвая. Мужчынка адзін захварэў, у бальніцу трапіў. Пасля выпіскі дактары санаторый параілі. Узяў пуцёўку, па дарозе да рабіна зайшоў. Кажа: «Рэбе, я ведаю, што норавы на курортах вольныя, што жанчыны агаляюцца да больш няма куды... Скажыце, мне можна ў іх бок глядзець?» — «Можна», — дазваляе рабін. «А калі на пляж пайду... Там дзяўчаты ў бікіні, а то і зусім галяком... На іх паглядзець не грэх?» — «Не, глядзі сабе». — «Рэбе, а пад забаронай што-небудзь ёсць? Ну такое, каб мне нельга было глядзець?» — «Ёсць». — «І што ж гэта?» — «Электразварка».**

Шкодны працэс і сапраўды. Мы на яго таксама глядзець не будзем. А вось на чарговы конкурсны здымак, напэўна, варта — хоць бы таму, што чытачы склалі да яго столькі подпісаў...

Такім чынам — паехалі (як двое ў санаторый: у купэ размясціліся, шампанскага выпілі... «Шкада, што піяніна не тут!» — уздыхнула жонка. — «А навошта яно?» — здзівіўся муж. — «Ды на ім нашы пуцёўкі ляжаць»).

Гэта значыць, што прыгоды людзям гарантаваныя, як і тое, што без іх (праўда, іншага кшталту) і курорт не курорт. Як заўважае **спадар Іван Астроўскі з Мінска:**

*Маем мужа, маем жонку —*
*Ўсё «чын-чынам» быццам звонку,*
*Бо жывём мы з імі ў згодзе.*
*Апынёмся ж «на прыродзе»...*
*І ў стальня гады*
*Пабяжым да маладых?!*

А яны, здараецца, гэтаму і рады. З пачутага: «З той пары, як пазнаёміўся з табой, не магу ні есці, ні піць, ні курыць». — «Так закахаўся?» — «Не... Проста ні на што больш грошай няма».

Ці яшчэ: дзядок адзін з маладой распісаўся. Вечарам заходзіць да яе і пытаецца: «Табе мама не расказвала, што далей рабіць?» — «Не...» — «Вось ліха дык ліха: ты не ведаеш, я забыўся...»

На здымку, праўда, хлопец зусім не з такіх... На думку **спадара Віктара Сабалеўскага з Узды,** ён толькі што вырашыў:

*Да русалкі прытулюся —*
*Незямная ж прыгажосць!*
*Няхай ведае Маруся:*
*Порах быў*
*і порах ёсць!*
*На вакзале мне казала:*
*«Ты ж, Васёк,*
*адпачывай!»*
*Фотку вышлю... Каб хоць знала:*
*Я й на моры не гультай!*

Ёсць як мінімум дзве прычыны, па якіх туды трэба ехаць: мора хвалюецца раз, мора хвалюецца два. Але... марна: не едзе народ. У апошнія гады — з-за каранавіруса, а раней проста грошай не было. (Анекдот: «Сёння ў краме сваю зарплату ўбачыў: на цэнніку для пантофляў». Ці яшчэ: «У вас ёсць магчымасць адкладваць грошы?» — «Магчымасць — ёсць, грошай — няма»).

Што зрабіць, каб было? Падказка: бяром крэсла, кладзём на яго рубель (можна еўра ці долар), садзімся — думаем, як узяць тое, што паклалі? Устаём. Забіраем... І адпаведна бачым: для таго каб займець грошы, трэба адарваць ад крэсла пятую кропку.

Варыянт, на жаль, не для ўсіх: некаму здароўе не дазваляе, некаму — адрывай не адрывай... А некаму проста не хочацца... Прычым не толькі грошай. Прыяцель некалі расказваў, як адна маладзіца яго ў госці запрашала. Што ён?.. «Як падумаю, — казаў, — што гэта ж на пяты паверх, без ліфта... Што потым пра нешта размаўляць... А то і раздзявацца... Ды ну яго!»

Па маладосці, выходзіць, ленавацца — і ці толькі ён? Што цяпер?

Адказ на гэтае пытанне ведае **спадарыня Валянціна Гудачкова з Жыткавічаў:**

*Ясь халодную зімой*
*Паглядзіць на здымак той,*
*Дзе з каменнаю дзяўчынай...*
*І...*
*Не грэюць успаміны!*
*Мо, каб потым не нудзіць,*
*Лепш жывую закадрыць?*

Самы час, здавалася б, і самае месца: возера, лета... Як трапна заўважае **спадарыня Любоў Чыгрынава з Мінска:**

*Ён на тое і ліпень,*
*Каб да дзевак ліпнуць.*
*А зімою мужчынок*
*Шусь да жонкі пад бачок...*
*Бо русалка ёсць русалка:*
*Не абдыме гэтак палка.*

Амаль тыя ж думкі і ў **спадара Эльяша Банеля з Мінска:**

*Дзеўка —*
*грэх не любавацца!*
*Ёсць за што мужчыне ўзяцца!*
*Янка, маючы спадзеў,*
*Да нагі яе падсеў...*
*Дурань!*
*Лепей бы з пяшчотай*
*Ён да той,*
*што робіць фота.*

І сапраўды, з гэтай кашы не зварыш. Як заўважае **спадарыня Соф'я Кусянкова з Рагачоўшчыны:**

*Муж абняў русалку?*
*Не зважае Алка,*
*Бо нічога ў іх...*
*Наўпрост:*
*Там хіба што рыбін хвост.*

Праўда, для таго каб гэта зразумець, мала паглядзець на красуню (а тым больш здалёк). Трэба...

Аб тым, што канкрэтна, хораша напісаў **спадар Мікалай Касмачэўскі з Навапалацка:**

*Ясь — дзяцюк немалады...*
*Глянуў — дзеўка ля вады*
*Нічыя і модная...*
*Ды*
*як лёд халодная!*
*Нецікава абдымаць...*
*Толькі і можна, што здымаць.*

Прычым — паводле **спадара Мікалая Старых з Гомеля** — з выхаваўчай мэтай:

*«Стала ты халоднай штосьці», —*
*Мовіў суджанай Антось.*
*Тая з ім тады кіруе*
*Да каменнае статуі,*
*Пад бачок яго саджае*
*І на відэа здымае,*
*Каб запомніў мужанёк,*
***Дзе** сапраўдны халадок.*

Здараецца, што ім мужчын не спалохаеш: як лічыць **спадарыня Валянціна Гудачкова,** не пераваліся яшчэ рамантыкі:

*Меў вось гэты кавалер*
*Досыць кавэрзны намер:*
*Пыпу ў вочы падпусціць,*
*Дзеўку тую ажывіць...*
*Каб пасля*
*ўсім хваліцца,*
*Што любіўся з вадзяніцай.*

З жонкай вадзянога, трэба разумець? Паводле **спадарыні Любові Чыгрынавай:**

*Русалку на беразе*
*скульптар ляпіў,*
*Пазіраваць*
*жонку сваю запрасіў.*
*Тая згадзілася —*
*Лёгка... За так...*
*Быў небагатым гэты мастак.*

І наўрад ці разбагацее, бо, як выглядае, за фоткі «на фоне» грошай не бярэ. Хоць, напэўна, і мог бы. З дыялогаў на рынку: «Газеты! Часопісы!.. За рубель — анекдоты!» — «За рубель? Давай!» — «Тады слухай...»

Невядома, колькі іх расказаў той гандляр, невядома і якіх, каб потым, у канцы працоўнага дня...

Ці ведалі вы, што найлепшае практыкаванне для рук — гэта пералічванне грошай: у працэсе здымаецца боль у суставах, нармалізуецца ціск, перастаюць балець галава і зубы, паляпшаецца зрок, апетыт, гардэроб, знешні выгляд і нават жыллёвыя ўмовы...

Зрэшты, мы адхіліліся — «збочылі» на грошы, а хацелі ж пра мужчын, пра жанчын, пра курортныя раманы... Тады з падачы **спадара Міколы Кісяля з Мінска:**

*Дома быў —*
*і жонка міла,*
*З дому з'ехаў —*
*і... астыла:*
*Цягне да чужой,*
*Хоць яна сядзіць статуяй,*
*Але ж гэту абдыму я!*
*Вось такі настрой.*

Якраз пра яго заўважана, што мужчына ніколі не здрадзіць каханай жанчыне, хіба калі моцна псіхане, ці нап'ецца, ці назло ёй, ці інтыму даўно не было, ці вельмі прыгожая падкруцілася, ці сама захацела... А так — ну ніколі ў жыцці!

Гэта — прозай. Вершаваныя радкі ад **спадарыні Таццяны Гнацюк**

*(Вабяць хлопцаў маладзіцы,*
*Прыгажуні — удвая!*
*Хай каменныя калені*
*Ды прыткнуўся муж Аленін —*
*Дзеўка ж нічыя?),*

і **спадарыні Валянціны Гудачковай:**

*Сустракаюцца жанкі,*
*Як каменныя слупкі:*
*Ні да вока ні да бока...*
*Хай яны жывуць далёка!*
*А жаніўся хтосьці здуру,*
*Дык абдыме і скульптуру!*

(Заўвага ад **спадарыні Соф'і Кусянковай:**

*Ой, не вер Сяржу, Алка,*
*Што на здымачку русалка:*
*Калі ласты з яе зняць,*
*Можна бабу адшукаць!*

І яшчэ — з таго ж канверта, пра тых самых сужэнцаў:

*Каля рэчкі неяк Алка*
*Мужа сфоткала з русалкай*
*І, вядома ж, не стрывала,*
*Хвост ёй мігам адарвала:*
*Хоць і рыбіна яна*
*Хай не лезе, дзе «жана»!*

Бо зараз і стаць ёй вельмі няпроста («Любы, мы з табой паўгода жывём. Можа, пазнаёміш са сваімі роднымі?» — «Не... Жонка з дзецьмі ў вёсцы, цешча на заробках»)... І быць таксама не лягчэй.

Зрэшты, песню «Замуж выйсці трэба знаць...» вы чулі. Зараз чытайце подпіс да здымка **ад спадара Віктара Сабалеўскага:**

*У адстаўцы,*
*Афіцэр...*
*І не зломак быццам...*
*Ды, як польскі кавалер,*
*Не бяжыць жаніцца.*
*За жыццё ён перабраў*
*Маладзіц нямала*
*«Вось такую б, кажа, узяў,*
*Каб яшчэ*
*ні маўчала».*

Трэба разумець, як рыба? Ці русалка?

З дыялогаў жанчын: «Ты свайго мужа песціш калінікалі?» — «Вядома ж!» — «А як?» — «Маўчу...»

У Оксфардскім універсітэце неяк конкурс правялі: папрасілі моваязнаўцаў адной фразай перадаць ідэю міру, спакою і шчасця. Перамог аўтар, проста геніяльнай на думку журы: «Жонка спіць». Бо калі прачнецца...

З таго ж канверта, ад **спадара Сабалеўскага:**

*«Трэба футра!»*
*«Хачу боты!»,*
*Купі «смарцік*
*і пярсцёнак...»*
*Набірае абароты,*
*Як капрызны той дзіцёнак!..*
*Пасля сёмага жадання*
*Муж цярпенне ўжо губляе:*
*«Яшчэ трошкі і...*
*расстанне —*
*Я ж не рыбка залатая!»*

З дыялогаў. Жонка — мужу: «Мне заўтра кроў трэба здаць — нашча... Нагадай, калі ласка». — «Як піць яе нашча, дык ты не забываешся, а як здаць, дык табе нагадай».

Адчулі? Муж не сварыцца, не скардзіцца, бо, ведае, што на жонку і машыну — нельга: сам выбіраў. (Дыялог — на гэты раз дзеда з унукам — на пляжы... «Табе падабаецца вунь тая бландзінка ў чырвоным купальніку?» — пытаецца старэйшы. «Яшчэ і як!» — адказвае маладзён. «А тая брунетка з пышным бюстам?» — «Таксама!» — «І шатэнка вунь тая нішто сабе?!» — «Праўду кажаш, дзядуля!» — «...Дык ты, унучак, запомні: будзеш добра вучыцца — будзеш мець выбар». (Ад сябе дададзім — не толькі па знешнасці). А таму, відаць, і гэты подпіс да здымка ад **спадара Сабалеўскага** цалкам лагічны:

*Белапенная красуня*
*Зноў на бераг узышла —*
*Без мадыстак і цырульняў*
*Многіх з розуму звяла:*
*Ба́цькі дзетак пакідалі,*
*Кавалеры — сваіх дам...*
*Хвалі Нарачы змаўчалі,*
*Колькі слёз праліта там...*

Вось на гэтай па-восеньску сумнай ноце і завяршыць бы чарговы конкурсны агляд, але ж трэба падвесці вынікі: нагадаць, што на мінулым конкурсным здымку *(гл. нумар «Звязды» за 29 верасня)* быў, скажам так, дзіцячы «кансіліум» каля старых «Жыгулёў». Дык вось найлепшыя радкі пра яго, паводле меркаваннняў вялікага чытацкага журы, склалі **сужэнцы Астроўскія з Мінска, спадары Мікалай Старых з Гомеля, Віктар Сабалеўскі з Узды, спадарыні Валянціна Гудачкова з Жыткавічаў, Соф'я Кусянкова з Рагачоўшчыны і Зоя Наваенка...**

Вось з гэтым, апошнім меркаваннем, пагадзілася і журы маленькае рэдакцыйнае. Таму прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сэрцам «Звязду» на першы квартал 2022 года накіроўваецца ў Глыбокае.

Хочаце, каб «родная газета на роднай мове» пяць разоў на тыдзень прыходзіла і да вас, тады варыянтаў два: першы — аформіць падпіску, другі — уважліва паглядзець на новы конкурсны здымак, прыдумаць подпіс (можна некалькі, але трапных, дасціпных, кароткіх — максімум восем радкоў) і даслаць у рэдакцыю.Шанц на выйгрыш мае кожны.

**Валянціна ДОЎНАР,**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

**Ад іх жа:** шчырыя прабачэнні тым, чые радкі не прайшлі строгага конкурснага адбору. Затое наступным разам...

**І яшчэ.** Калі матэрыял быў падрыхтаваны да друку, у рэдакцыю прыйшло яшчэ некалькі ўдалых радкоў ад **спадара Кулікова з Мінска:**

*На курорт ад'ехаў Даня,*
*Думаў, жонка не дастане.*

І яшчэ:

*Абдымае Ясь чужую,*
*а Яніна не раўнуе?*
*Значыць, нехта з трох —*
*статуя...*

Што ёсць, тое ёсць. Пішыце!







Пяць гадоў таму ў сталіцы была пабудавана спецыялізаваная пляцоўка для асвойвання і правядзення экстрэмальных відаў спорту пад назвай скейт-парк. І тады, і сёння тэрыторыя пад адкрытым небам была і застаецца самым буйным скейт-цэнтрам у краіне і надзвычай запатрабаваная. Яна размешчана на вуліцы Сталетава, створана па адмысловым праекце і палюбілася актыўным падлеткам і моладзі. Не было такога дня, каб парк пуставаў, каб на разгонных горках і флайбоксах не было аматараў паганяць. Хтосьці прыходзіць адточваць майстэрства на кік-скутарах (самакатах), «дошках», трукавых BMX- і MTB-роварах, іншыя — паглядзець на іх «вышэйшы пілатаж», як яны ўмеюць выконваць паветраныя фігуры. Мода на скейтынг захапіла не толькі хлопчыкаў. Дзяўчынкі таксама маюць свае сродкі катання і не саступаюць першым у спрыце і хуткасці, таксама прагнучы быць «крутымі». Тут хапае месца ўсім — і пачаткоўцам, і «сераднякам», і прафесіяналам, бо плошча скейт-парка — дзевяцьсот квадратных метраў, на ёй адначасова могуць катацца шэсцьдзясят чалавек. Лакацыя разлічана для правядзення паказальных выступленняў і буйных спаборніцтваў, такіх як адкрыты чэмпіянат Belarus Skateboard Challenge.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**



# ТЭРЫТОРЫЯ ДЛЯ «КРУТЫХ»











# Правила проведения рекламной игры

# «Оставь отзыв про твой Samsung!»

В настоящих Правилах проведения Рекламной игры «Оставь отзыв про твой Samsung!» нижеперечисленные термины имеют следующие значения:

**Игровой код** – номер, присваиваемый письму Участника при соблюдении правил участия в Рекламной игре.

**Участник** – физическое лицо, которое выполнило требования, необходимые для участия в Рекламной игре.

**Учетная запись (профиль)** – хранимая в компьютерной системе совокупность данных о пользователе сайта, необходимая для его аутентификации и предоставления доступа к его личным данным и настройкам.

**1. Организатор Рекламной игры.**

Общество с ограниченной ответственностью «Смарт Идея», далее именуемое «Организатор», 220035, г. Минск, ул. Тимирязева, 65А, офис 417 зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 193019075, свидетельство о государственной регистрации выдано 11.01.2018.

**Заинтересованные лица Рекламной игры.**

Заинтересованным лицом Рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «Гетбоб», Республика Беларусь, г. Минск, ул. Октябрьская, 23А, 2-й этаж, каб. 1. УНП 191682347.

**2. Наименование Рекламной игры** – «Оставь отзыв про твой Samsung!»

**3. Территория проведения.**

Рекламная игра «Оставь отзыв про твой Samsung!» проводится на территории Республики Беларусь.

**4. Срок начала Рекламной игры** – 30 ноября 2021 года, **срок окончания** – 31 января 2022 года (включая период розыгрыша и выдачу призов, опубликования результатов проведения Рекламной игры).

**5. Состав комиссии по проведению Рекламной игры:**

1. Председатель комиссии: Шамаль Дмитрий Эдуардович, директор ООО «Смарт Идея»;

2. Моисеева Анастасия Юрьевна, специалист ООО «Смарт Идея»;

3. Мазура Сергей Михайлович, специалист отдела медиапланирования ООО «Смарт Идея»;

4. Носаль Роман Чеславович, специалист ООО «Гетбоб»,

5. Анастасия Албут, специалист по рекламе ООО «Гетбоб».

**6. Цель Игры.**

**Рекламная игра** «Оставь отзыв про твой Samsung!» проводится с целью стимулирования отзывов о товарах ТМ Samsung:

- наушники,
- смартфоны,
- наручные часы,
- планшеты,
- стиральные \сушильные машины,
- холодильники,
- пылесосы,
- микроволновые печи,
- варочные поверхности,
- духовые шкафы,
- посудомоечные машины,
- телевизоры на сайтах: www.5element.by, www.21vek.by, www.sila.by, www.catalog.onliner.by, imarket.by, shop.mts.by и с целью увеличения продаж данных групп товаров.

**7. Условия участия и порядок отбора участников Рекламной игры.**

7.1. Участник – физическое лицо, являющееся зарегистрированным пользователем любого из сайтов: www.5element.by, www.21vek.by, www.sila.by, www.catalog.onliner.by, imarket.by, shop.mts.by, выразившее желание принять участие в Рекламной игре на условиях, предусмотренных настоящими Правилами.

7.2. В Рекламной игре могут принимать участие совершеннолетние граждане Республики Беларусь, а также совершеннолетние иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство в Республике Беларусь и постоянно проживающие на территории Республики Беларусь.

7.3. Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства. К участию не допускаются члены Комиссии.

7.4. Порядок участия в Рекламной игре:

Для участия в Рекламной игре Участнику необходимо в срок **с 30 ноября 2021** года **до 13 января 2022** года включительно выполнить следующие условия:

1. Изучить правила проведения Рекламной игры, размещенные на сайте: https://zerowastecontent.by.

2. Пройти Регистрацию для получения Игрового кода:

2.1. Для регистрации достаточно в период **с 30.11.2021 по 13.01.2022** оставить уникальный отзыв о товаре ТМ Samsung, указанном в п.6. настоящих Правил на любом из сайтов: www.5element.by, www.21vek.by, www.sila.by, www.catalog.onliner.by, imarket.by, shop.mts.by. Исключение составляют товары, снятые с продажи и недоступные для заказа на сайте. Отзыв считается уникальным, если его содержание не повторяет содержание ранее опубликованных отзывов на других ресурсах.

Отзыв должен представлять собой комментарий о потребительских свойствах и особенностях товара, личных впечатлениях от его использования. Объем – не менее 10 слов. Отзыв должен быть написан на русском или белорусском литературном языке согласованными предложениями, соответствовать требованиям морали, не содержать ненормативной лексики, жаргона, оскорблений и т. п. Организатор не несет ответственности за достоверность содержащихся в отзыве сведений.

2.2. **Выслать** на e-mail: samsung@getbob.by

- скриншот своего **опубликованного на сайте отзыва** /ссылку на **свой опубликованный на сайте отзыв** о любом товаре ТМ Samsung, указанном в п.6 настоящих Правил,

- скан/фото гарантийного талона на данный товар. Товар должен быть приобретен на территории Республики Беларусь.

Скриншот отзыва Участника должен включать в себя шапку с адресом сайта, Учетную запись Участника) и текстовую область (отзыв Участника).

В гарантийном талоне должна указываться следующая информация: наименование товара, модель товара, серийный номер. Для регистрации в Рекламной игре Участник может использовать неограниченное количество гарантийных талонов на товары ТМ Samsung.

**В письме Участник должен указать следующие данные**: — фамилия (обязательно), имя (обязательно), отчество (обязательно, если таковое имеется); — абонентский номер мобильного телефона белорусского оператора сотовой связи Участника в международном формате (обязательно);

— фактический адрес проживания.

После выполнения вышеперечисленных условий Участнику, оставившему **уникальный отзыв** о товаре ТМ Samsung, указанном в п.6 настоящих Правил, на одном из сайтов: www.5element.by, www.21vek.by, www.sila.by, www.catalog.onliner.by, imarket.by, shop.mts.by присваивается **Игровой код**. При этом Участник может оставить не более двух отзывов на одну единицу товара Самсунг на одном сайте в рамках одного розыгрыша.

Присвоенный Игровой код Участник получает в ответном письме на адрес электронной почты.

Игровой код присваивается Участникам по дате опубликованного на одном из сайтов: www.5element.by, www.21vek.by, www.sila.by, www.catalog.onliner.by, imarket.by, shop.mts.by – уникального отзыва о товаре ТМ Samsung, указанном в п.6 настоящих Правил.

**8. Состав и размер призового фонда.**

Призовой фонд Игры сформирован за счет денежных средств и имущества Заинтересованного лица – **ООО «Гетбоб»**. Размер Призового фонда составляет **9 450,00** (девять тысяч четыреста пятьдесят) белорусских рублей 00 копеек.

Таблица 1

| № | Наименование | Название приза далее в Правилах | Кол-во, шт. | Цена, бел. руб. (1 шт.) | Общая стоимость, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Смарт-телефон SAMSUNG SM-F711B, 128GB, цвет черный (SM-F711BZKASER), страна происхождения – Вьетнам | **«Приз 1»** | 1 | 2 760,00 | 2 760,00 |
| | Денежные средства | | 1 | 390,00 | 390,00 |
| 2 | Смарт телефон SAMSUNG SM-F711B, 128GB, цвет черный (SM-F711BZKASER), страна происхождения – Вьетнам | **«Приз 2»** | 1 | 2 760,00 | 2 760,00 |
| | Денежные средства | | 1 | 390,00 | 390,00 |
| 3 | Смарт телефон SAMSUNG SM-F711B, 128GB, цвет черный (SM-F711BZKASER), страна происхождения – Вьетнам | **«Приз 3»** | 1 | 2 760,00 | 2 760,00 |
| | Денежные средства | | 1 | 390,00 | 390,00 |

**9. Место, дата, время и порядок розыгрыша призового фонда, порядок определения выигравших участников Рекламной игры.**

Розыгрыши призов проводятся открыто в присутствии Комиссии по адресу: г. Минск, ул. Октябрьская, 23А, офис 1С в 15.00 согласно указанному ниже графику:

таблица 2

| Номер розыгрыша | Период регистрации | | Дата розыгрыша | Наименование приза |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 30.11.2021 | 14.12.2021 | 15.12.2021 | **«Приз 1»** |
| 2 | 15.12.2021 | 29.12.2021 | 30.12.2021 | **«Приз 2»** |
| 3 | 30.12.2021 | 13.01.2022 | 17.01.2022 | **«Приз 3»** |

К моменту Розыгрыша призов данные об Участниках Рекламной игры формируются в список Игровых кодов Участников (далее – Список) с указанием фамилии, имени, отчества (при наличии), абонентского номера мобильного телефона белорусского оператора сотовой связи Участника в международном формате, адреса электронной почты, с прикрепленным сканом гарантийного талона на товар Samsung и скриншотом или ссылкой на **опубликованный отзыв** Участника на любом из сайтов: www.5element.by, www.21vek.by, www.sila.by, www.catalog.onliner.by, imarket.by., shop.mts.by.

Розыгрыш призов – **Приз 1/ Приз 2/ Приз 3 –** производится согласно таблице 2. В каждом розыгрыше принимают участие Игровые коды, зарегистрированные любым Участником в течение соответствующего периода регистрации – с 0 часов первого дня до 24 часов последнего дня любого периода, указанного в столбце «Период регистрации» по следующей схеме:

- к моменту каждого розыгрыша приза **Приз 1/ Приз 2/ Приз 3** данные об Участниках игры формируются в Список номеров Игровых кодов участников текущего периода регистрации;

- Игровые коды Участников в списке имеют порядковые номера от 1 и выше в зависимости от даты и времени регистрации каждого участвующего в розыгрыше отзыва в течение одного периода регистрации.

Для проведения каждого розыгрыша используется специальный барабан с количеством ячеек и набором шаров, которые соответствуют максимальному разряду номеров из Списка номеров Игровых кодов Участников. Выигрышный номер определяется путем его формирования справа налево из номеров шаров, случайно поочередно извлекаемых из ячеек барабана членом комиссии. В ячейку, соответствующую максимальному разряду последнего зарегистрированного индивидуального порядкового номера, выкладываются шары с номерами от 0 до цифры максимального разряда последнего зарегистрированного порядкового номера. В остальные ячейки вкладываются по 10 шаров с номерами от 0 до 9. Из всех ячеек барабана поочередно извлекается по одному шару справа налево, которые последовательно формируют выигрышный номер. Производится проверка сформированного номера на наличие полученной комбинации цифр в Списке Участников. При наличии совпадения выпавший номер считается выигравшим. В противном случае производится повторная выемка с составлением номера. Таким образом, для каждого приза **Приз 1/ Приз 2/ Приз 3** формируется один выигрышный и один резервный номер.

Результаты каждого розыгрыша фиксируются в Протоколе, который подписывается всеми присутствующими членами Комиссии.

**10. Порядок уведомления победителей о результатах Розыгрыша. Место, порядок и срок получения выигрышей.**

10.1. Победители уведомляются о выигрыше по почте не позднее 3 рабочих дней после каждого розыгрыша посредством направления уведомления на адрес электронной почты победителя, и/или по контактному номеру, указанному в письме.

10.2. Порядок получения выигрышей:

